

НА ШТО РАЗЛІЧВАЦЬ ПАРАЛІМПІЙЦАМ?
5

ЧЫМ ЖЫВЕ АЙЧЫННЫ КІНЕМАТОГРАФ
8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

29 КРАСАВІКА 2023 г. СУБОТА № 81 (29961)

# Свята для ўсіх пакаленняў




Фота БелТА.

Паважаныя суайчыннікі!

Прыміце віншаванні са Святам працы!

Стаўшы сапраўды народным, Першамай аб'ядноўвае людзей розных пакаленняў, усіх, хто працуе на карысць Радзімы.

Добрасумленныя і адказныя адносіны да справы дазволілі беларусам выстаяць у самыя складаныя перыяды гісторыі і пабудаваць незалежную дзяржаву. Служэнне агульнай мэце заўсёды было і застаецца крытэрыем поспеху і прызнання на нашай зямлі.

Ствараючы і рэалізоўваючы задумы і мары, мы надаём жыццю сэнс, асабістымі поспехамі і дасягненнямі памнажаем нацыянальны здабытак.

Шчыра жадаю, каб кожны чалавек знайшоў сваё прызначэнне, якое прыносіла б радасць новых адкрыццяў і самарэалізацыі. Дзякую прадстаўнікам усіх прафесій за штодзённыя працоўныя подзвігі, майстэрства і пастаяннае імкненне да развіцця.

Міру і дабра вам! З Першамаем!

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «КАЛІ МЫ ВЫТРЫМАЕМ, МЫ ЗОЙМЕМ СВАЁ ПАЧЭСНАЕ МЕСЦА Ў ГЭТЫМ СВЕЦЕ»

**На Гомельшчыне Прэзідэнт выклаў праграму дзеянняў для ўсёй краіны**

Фота БелТА.



**Вядомая вясновая традыцыя — паездка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў рэгіёны, пацярпелыя ад наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Але гаварыць на гэтых землях трэба сёння найперш аб развіцці. Таму, як і заўсёды падчас рабочых візітаў Прэзідэнта ў рэгіёны, на першым плане — сучасная сітуацыя ў вобласці, яе праблемы, дасягненні і планы на будучыню. Сёлета кіраўнік дзяржавы ў рамках чарнобыльскай паездкі новага фармату наведаў Веткаўскі раён. У пачатку тыдня Аляксандр Лукашэнка правёў нараду па развіцці Гродзенскай вобласці. Так, за адзін тыдзень на найвышэйшым узроўні быў атрыманы зрэз развіцця рэгіёнаў і дадзены адпаведныя даручэнні.**

## Хапае ўсяго — не хапае толькі дысцыпліны

Праграма візіту ў Ветку атрымалася насычанай. У першую чаргу Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з ходам правядзення пасяўной кампаніі. І адразу пасля прылёту ўзняў пытанне ўкамплектаванасці малочнатаварных комплексаў. Прэзідэнт пацікавіўся, ці поўнасцю ўкамплектаваны жывёлай пабудаваныя новыя і мадэрнізаваныя МТК. Яму далажылі, што пакуль не, але работа ў гэтым кірунку вядзецца. Даручэнне кіраўніка дзяржавы: усе гэтыя МТК павінны быць поўнасцю ўкамплектаваны жывёлай, бо інакш не акупяцца ўкладзеныя сродкі. «Наракайце самі на сябе, калі вы новыя і рэканструяваныя комплексы не запоўніце», — папярэдзіў ён. Гэта пытанне актуальнае не толькі для Гомельскай вобласці, але ў рознай ступені для ўсёй краіны. Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што вельмі важна, якой менавіта жывёлай будуць укамплектоўвацца комплексы, як будуць арганізаваны ўтрыманне і догляд жывёл. Надой малака на новых комплексах ніяк не можа быць ніжэйшы нават за сярэднерэспубліканскі і абласны ўзроўні. «Трэба ў два разы больш», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тэмпы меліярацыі, якія, па яго патрабаванні, трэба паскараць. Паводле яго слоў, меліярацыя ідзе вельмі марудна. «Сёння гэтую капейку (сродкі на меліярацыю) вырвалі трыма пальцамі, а заўтра можа не быць. І пад адказнасць кіраўнікоў. Трэба адказваць, сачыць за каналамі, дамбамі, рэгуляваць водны рэжым. Пад подпіс кожнаму кіраўніку: восць твае палі — адказвай», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама зрабіў акцэнт на тым, што неабходна імгненна працаваць над выратаваннем некаторых участкаў, якія, занядбаныя, пакідаюць самае цяжкае ўражанне. Па словах кіраўніка дзяржавы, укладзеныя ў меліярацыю грошы трэба расходаваць эфектыўна і ў будучыні сачыць за станам гэтых тэрыторый. «Каб нашы дзеці потым зноў не разгортвалі гэту работу. Жалезная павінна быць дысцыпліна. Падтрымліваць трэба. Гэта залатыя землі», — заявіў ён.

СТАР. 2

КОРАТКА

• **Больш за 33 тысячы кватэр і дамоў пабудавалі ў Гомельскай вобласці па чарнобыльскіх дзяржпраграмах.**

• Плацяжы ад дзейнасці Брэсцкай мытні за студзень — сакавік напалову перавысілі леташні паказчык.

ISSN 1990 — 763X

23081

Лічбавы беларус

# КАРШЭРЫНГ, ДТЗ, ПРАВАПАРУШЭННІ...

**Якімі звесткамі забяспечвае МУС беларусаў праз іх асабісты кабінет**

**Кожны ўладальнік асабістага электроннага кабінета, які актывізаваў яго, праз адзіны партал электронных паслуг без праблем можа даведацца марку аўтамабіля, наяўнасць страхоўкі і тэхагляду аўта, праверыць, ці не знаходзіцца машына ў вышуку, ці не трапляла яна ў ДТЗ і запытаць шмат якія іншыя параметры аўта. А яшчэ — праверыць наяўнасць правоў кіроўцы, каб даць машыну ў арэнду. Якія яшчэ электронныя паслугі з інфармацыяй ад Міністэрства ўнутраных спраў можа заказаць беларус, расказалі ў Нацыянальным цэнтры электронных паслуг (НЦЭП).**

## Ведай усё пра аўто

У жніўні 2022-га на адзіным партале з'явілася комплексная паслуга **3.58.01 «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто»**. Дзякуючы ёй, ведаючы толькі VIN-нумар машыны і зрабіўшы толькі адзін запыт, можна атрымаць звесткі пра аўто з чатырох інфармацыйных рэсурсаў: ДАІ, Белтэхагляду, Беларускага бюро па транспартным страхаванні і інфармацыйнай сістэмы транспартных сродкаў (ТС), якія адшукваюцца. А ўжо з 15 лютага сёлета паслугу ўдасканалілі — у яе дадалі магчымасць атрымліваць звесткі, ці не трапляла машына ў ДТЗ (пры гэтым кошт паслугі не павялічыўся і застаўся 3,36 рубля).

СТАР. 13

# «КАЛІ МЫ ВЫТРЫМАЕМ, МЫ ЗОЙМЕМ СВАЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнта пазнаёмілі са створанай сістэмай па рамонце і аднаўленні старой тэхнікі. Прысутным журналістам Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, аб чым ідзе размова. Так, тэхніку, якая праслужыла ў гаспадарках 5—7 гадоў і якую «кінулі пад плот», вырашылі дастаць, аднавіць і даць новае жыццё. Ідэя атрымалася і дала пазітыўны вынік. «Сістэма наладжана правільна, гэтым шляхам трэба ісці», — даў сваю ацэнку Прэзідэнт. Але ён заўважыў, што гэтая ідэя павінна была зыходзіць не ад яго — у першую чаргу на месцах трэба беражліва і гаспадарску абыходзіцца з тэхнікай. «Абыходзімся расхлябана, не беражом яе. А гэта грошы!» — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, камбайн Гомсельмаша павінен працаваць мінімум 15 гадоў. Тое ж самае датычыцца і трактарнай тэхнікі. Ён нагадаў, як яго знаёмы амерыканскі фермер высока ацаніў беларускі трактар, які пасля 30 гадоў эксплуатацыі быў спраўны і поўнасцю ў рабочым стане.

***«Наступае жалезная дыктатура.*** Засядзеліся ў Мінску, праводзім нараду ў Гродне (нарада па развіцці Гродзенскай вобласці) — поўны адрыў урада ад губернатара», — звярнуў увагу Прэзідэнт на важнасць кадравай дысцыпліны. Але ў той жа час, па яго словах, важна выпрацаваць і неабходную нарматыўную прававую базу. Паколькі безгаспадарчае стаўленне і расхлябанасць не павінны заставацца беспакаранымі.

***«Павінна быць вось такая сістэма выпрацавана, калі мы не хочам ваяваць так, як яны ваююць на поўдні. Нам патрэбны нарматыўныя акты»***, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён канстатаваў, што сёння хапае ўсяго — не хапае толькі дысцыпліны.

## МЫ МОЖАМ СЁННЯ ЯШЧЭ БАГАЦЕЙШЫМІ СТАЦЬ, ЛЕПШ ЖЫЦЬ

У Ветцы Прэзідэнт таксама наведаў храм Праабражэння Гасподняга і запаліў свечку. Кіраўнік дзяржавы ўсклаў кветкі да памятнага знака ў гонар населеных пунктаў, якія спынілі сваё існаванне ў выніку чарнобыльскай трагедыі.

А каля храма Прэзідэнта чакалі жыхары Веткі, якія хацелі сустрэцца. Аляксандр Лукашэнка цёпла паразмаўляў з месцічамі, абмяняўся меркаваннямі. Некаторыя нават выказалі нараканні на стан мясцовых праблем. Усё было прынята да ўвагі, кіраўнік дзяржавы даў адпаведныя даручэнні адказным асобам. «Вялікі дзякуй ад шматдзетных. Я грамадзянка Украіны, і вы мне далі грамадзянства Беларусі. Я гэтым вельмі моцна ганаруся. І жыву. У мяне чацвёра дзяцей. Вялікі вам дзякуй», — звярнулася адна з жанчын да Прэзідэнта. «Малайчына, што чацвёра дзяцей!» — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Веткаўчане шмат гаварылі пра важнасць міру і спакойнага жыцця для дзяцей і ўнукаў. «Я ваяваць не хачу», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, на што людзі адказалі апладысментамі. «Мы таксама не жадаем! Нам патрэбен мір!» — пачулася з натоўпу. А Прэзідэнт у адказ папрасіў ад людзей толькі аднаго, ужо класічнага — на сваім месцы якасна рабіць сваю працу. ***«Рынкі адкрыты як ніколі. Мы можам сёння яшчэ багацейшымі стаць, лепш жыць. Проста трэба сабрацца»***, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## «МЫ ЎМЕЕМ РАБІЦЬ УСЁ ЯК ТРЭБА, АЛЕ НЕ ЗАЎСЁДЫ РОБІМ»

Пра тое, што трэба сабрацца, каб стаць багацейшымі, лепей жыць, але ўжо больш грунтоўна Аляксандр Лукашэнка гаварыў на нарадзе з актывам Гомельскай вобласці. «Мы ўмеем рабіць усё як трэба. Чаму не робім? Ці, дакладней, чаму не заўсёды робіцца ўсё як трэба? Пра гэта сёння пойдзе гаворка», — задаў тон нарады кіраўнік дзяржавы.

Ён звярнуў увагу, што для Гомельшчыны за гады незалежнасці дзяржавай было зроблена нямала. «Я бачыў сёння ў Ветцы радасныя твары. І ў чым асаблівасць: калі ўзнялі нейкія дробныя пытанні, то жанчыны і іншыя гэтага чалавека адсоўваюць: «Ды гэта не Прэзідэнта пытанне, гэта не галоўнае. Галоўнае, каб быў мір, каб не прылятала сюды, як там побач, каб людзі жылі на мірнай зямлі», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — ***Людзі нарэшце сваім прыярытэтам зрабілі нармальнае спакойнае, мірнае жыццё і жыццё сваіх дзяцей. Гэта прыярытэт сёння на Гомельшчыне, ды і па ўсёй краіне. Лепш у полі «ваяваць», чым там.*** Вы гэта ведаеце лепш за мяне, вы сталі прыфрантавой вобласцю», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

За час пераадолення наступстваў чарнобыльскай катастрофы рэалізавана пяць спецыяльных «чарнобыльскіх» праграм, зараз выконваецца ўжо шостая. У пацярпелыя рэгіёны толькі летась укладзена больш за 600 мільёнаў рублёў, а ў цэлым — мільярды. На гэтыя грошы пабудавана шмат сацыяльных аб'ектаў, жылля, дарог, праведзены газ. Па словах Прэзідэнта, калі ў першае дзесяцігоддзе пасля аварыі змагаліся ў прамым сэнсе слова за выжыванне, то ў апошнія гады ідзе гаворка аб развіцці. Актыўна абмяркоўваецца ўцягванне ў сельскагаспадарчы абарот зямель, будаўніцтва малочнатаварных і адкормачных комплексаў, стварэнне эфектыўных прамысловых прадпрыемстваў. «Што-што, а вам крыўдзіцца на гэта няма чаго. Няма ніводнага больш-менш буйнога горада, дзе я не пабываў бы і не запланаваў будаўніцтва, няхай дрэваапрацоўчых, цэлюлозных, нафтаперапрацоўчых заводаў. Нямала для Гомельшчыны зроблена. Самая развітая ў прамысловым плане — Гомельская вобласць, не лічачы Мінск», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, рэгіёну трэба шукаць, а яшчэ лепш — ствараць драйверы эканамічнага росту ў найбліжэйшай будучыні. «Таму сёння я прыняў рашэнне адысці ад практыкі традыцыйнага «чарнобыльскага» візіту і правесці рабочую нараду аб сітуацыі ў рэгіёне ў цэлым. Каб тут, на месцы, абмеркаваць, куды рухаецца Гомельшчына, чаго вам не хапае, чым, магчыма, яшчэ дапамагчы», — сказаў ён.

Прэзідэнт расказаў аб тым, што, паводле інфармацыі, якую яму дакладваюць, вынікі першага квартала гэтага года далёка не такія, як абяцала кіраўніцтва рэгіёна. Па тэмпах развіцця эканомікі вобласць займае 4-е месца (ВРП — 99,2 працэнта, ВУП — 97,9 працэнта). Па яго словах, хоць прамысловасць спрацавала нядрэнна (рост на 4,4 працэнта, па краіне — на 1,8 працэнта), але тэта ў большай ступені ўклад арганізацый рэспубліканскай формы ўласнасці (іх удзельная вага — каля 80 працэнтаў), якімі займаецца ўся краіна. «А што ў вашай зоне адказнасці — у сельскай гаспадарцы? Тэмпы не дацягваюць да 100 працэнтаў. І апошняе месца ў краіне», — адзначыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў веснавых палявых работах, правядзенні меліярацыйных мерапрыемстваў, аднаўленні замартызаванай тэхнікі бышцам бы пакуль нядрэнна. Але куранят восенню лічаць. Таму, па словах, Прэзідэнта, трэба пагаварыць і аб іншым.

## «ХЛУСНІ БЫЦЬ НЕ ПАВІННА. НЕ АТРЫМАЕЦЦА»

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў лістападзе мінулага года правялі даволі прадметную, недзе нават жорсткую нараду па стратэгіі развіцця аграпрамысловага комплексу вобласці. Расставілі акцэнты, узгаднілі падыходы, атрымалі запэўніванні кіраўнікоў, што работа будзе весціся напружана і з поўнай аддачай. «Вось толькі апошняе не моцна адчуваецца, — заўважыў Прэзідэнт. — Многія праблемы вы спрабуеце вырашыць за кошт узбуйнення гаспадарак або далучэння іх да магутных прамысловых прадпрыемстваў. А які эфект? Вы павінны бачыць ужо цяпер».

Ён падкрэсліў, што аб'яднанне гаспадарак, іх узбуйненне вакол малочнатаварных комплексаў і абсталяванне іх новай тэхнікай — гэта добра, калі гэта так. Але, як заўважыў Прэзідэнт, калі да жабрацкага далучыць збяднелае, яно жабрацкім і застанецца.

«Непрыбраная салома, зарослая травой арганіка. Безгаспадарных і невыкарыстоўваных будынкаў і збудаванняў — процьма. Належнага парадку пакуль няма. І самае небяспечнае, што не прадбачыцца сёлета», — расказаў Аляксандр Лукашэнка пра назіранні, якія зрабіў, аблятаючы вобласць. Ён падкрэсліў, што, згодна з той інфармацыяй, якую яму дакладваюць, не ўдалося выкараніць прыпіскі і падзеж жывёлы. Напрыклад, у Ельскім раёне падзеж павялічыўся ў 2 разы, у Добрушскім і Лельчыцкім — у 1,8. За тры месяцы бягучага года ў цэлым па вобласці толькі цялят узросту да шасці месяцаў прапала амаль чатыры тысячы галоў.

«Колькі яшчэ нам вучыць кадры, дапамагаць ім, каб яны асвоілі элементарнае, асновы? Вучыць тут нікога не трэба, усе ведаюць, як гэта рабіць, але чамусьці не робіцца», — задаў рытарычныя пытанні кіраўнік дзяржавы.

Працягваючы тэму Лельчыцкага раёна, Прэзідэнт нагадаў пра сваё даручэнне дасканала разабрацца па кожным аб'екце і праекце ў Лельчыцкім прамысловым парку, некаторыя з якіх закранаюць яшчэ і суседнія раёны. «Мы шмат разважаем, раімся, ва ўрадзе праходзяць нарады. Але далей за словы справа чамусьці не ідзе», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на развіццё Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка і Нацыянальнага парку «Прыпяцкі». З гэтага года Палескі запаведнік перайшоў ад Міністэрства па надзвычайных сітуацыях пад упраўленне Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, як працуе запаведнік у цяперашніх умовах, ці захавалі там парадак, які быў пры ваенізаванай структуры?

«Ведаю, што вы там займаецеся пчалярствам, рыбаводствам. Без антрапагеннай нагрузкі выдатна адчуваюць сябе і расліны, і жывёлы, асабліва рэдкія і чырванакніжныя. Коні Пржэвальскага прыйшлі. Там цяпер рай для навукоўцаў. І турыстам такое цікава. Ці выкарыстоўваем мы гэтую разнастайнасць?» — спытаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на нарадах па эканоміцы ўвесь час ставіцца задача зніжэння залежнасці пакашчыкаў рэгіёнаў ад работы прамысловых гігантаў рэспубліканскага значэння, напрыклад, Мазырскага НПЗ, Жлобінскага БМЗ, Светлагорскага ЦКК, Добрушскай папяровай фабрыкі. Прэзідэнт спытаў, як выконваецца яго даручэнне «адзін раён — адзін новы праект», дзе павінна быць бачная ініцыятыва мясцовай вертыкалі. «Ці не падмяняеце паняцці? Гэта сапраўды прынцыпова новыя вытворчасці са створанымі працоўнымі месцамі ці простае вылучэнне аднаго са звыклых кірункаў работы старых прадпрыемстваў? — спытаў ён. — Тут падмены быць не павінна. І хлусні таксама — не атрымаецца», — папярэдзіў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што малочна-дальныя блокі, вытворчасць пелет — справа патрэбная. Але ж гаворка ідзе перш за ўсё пра інавацыйныя высокатэхналагічныя вытворчасці. Пажадана на мясцовай сыравіне.

## «ВАША ЗАДАЧА — ЭКАНОМІКА, ДАЙЦЕ ЭКАНОМІКУ»

***«Мяне ніхто не пераканае ў іншым: развіццё раёна, гаспадаркі ці прадпрыемства залежыць ад паваротлівасці найперш кіраўніка і рашэнняў, што прымаюцца на месцах.*** Тады адразу відаць, дзе талковыя кіраўнікі. Там праблем няма і ўсё працуе як гадзіннік. А дзе наадварот — там наадварот. У цяперашніх умовах гэта асабліва важна. Гомельшчына — прыгранічны рэгіён. Вы прыфрантавая зона», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што беларусы — мірныя людзі, якім чужой зямлі не трэба. Прэзідэнт заўважыў, што менавіта з Гомельшчыны, з горада Камарына ў верасні 1943-га (23 верасня 1943 г.) пачалося вызваленне Беларусі ад фашысцкай поскудзі. Па яго словах, менавіта тут, у Камарыне, у верасні трэба даць добры старт юбілейным мерапрыемствам, прымеркаваным да 80-годдзя вызвалення ўсёй краіны.

***«Яшчэ раз паўтаруся: забеспячэнне міру і бяспекі — гэта справа Прэзідэнта і сілавога блока. Ваша задача — стварэнне годных умоў для жыцця людзей. Ваша задача — эканоміка, дайце эканоміку.*** І тут вы недапрацоўваеце. Як мне дакладваюць, 45 працэнтаў дарог рэгіёна маюць дэфекты пакрыцця. Ёсць нараканні насельніцтва на работу службаў ЖКГ, добраўпарадкавання. Турбуе грамадзян стан аўтобуснага парка і работа гарадскога транспарту, асабліва ў гадзіны пікавых нагрузак», — абазначыў праблемы беларускі лідар, прывёўшы блізкі прыклад. У аварыйным стане знаходзіцца мост на галоўнай артэрыі, якая злучае Ветку з Гомелем. Таксама, па словах Аляксандра Лукашэнкі, людзі закідалі зваротамі: няма чыгуначнага пераезду ў мікраёне Заходні ў Жлобіне. Дзеткі і іх бацькі ходзяць у дзіцячы садок і школу па чыгуначных пуцях...

Больш чым актуальнай праблемай цяперашняй вясны стала паводка. Як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, тэма не новая. І ў пэўнай ступені гэта шчасце, улічваючы, што заўсёды гэтыя землі просяць вільгаці. Сож, Дняпро, Прыпяць — рэкі з норавам. Хоць старажылы кажуць, што такога не было даўно. «Але ці ўсё мы ўлічваем і ці заўсёды гатовы да такіх сітуацый? Чаму сёлета атрымаўся аўрал нейкі?!» — запытаў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, ускладніў гэты аўрал інфармацыйны вакуум з боку мясцовай улады. ***«З людзьмі трэба размаўляць, своечасова даводзіць да іх інфармацыю. У адваротным выпадку гэта будуць рабіць іншыя.*** І такія прыклады ўжо былі. І займаліся гэтым людзі з Гомельшчыны з вядомымі прозвішчамі. ***Большасць пытанняў павінна вырашацца на месцах і без сацыяльных выбухаў.*** Вы кіраўнікі. Людзі ў крытычнай сітуацыі чакаюць ад вас хуткіх, разумных і зразумелых дзеянняў, дакладнай інфармацыі. З людзьмі трэба размаўляць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

## «КАЛІ КІРАЎНІК БУДЗЕ ГАРЭЦЬ НА ПРАЦЫ — ТАДЫ БУДЗЕ ТОЛК»

З дакладам аб развіцці Гомельскай вобласці выступіў старшыня аблвыканкама Іван Крупко. Свой пункт гледжання на развіццё Гомельскай вобласці далажыў кіраўнік спраў Прэзідэнта, упаўнаважаны па Гомельскай вобласці Юрый Назараў. Ён расказаў аб рашэннях па недапушчэнні адтоку кваліфікаваных кадраў, выяўленых выпадках фармалізму ў рабоце з кадрамі і адсутнасці дысцыпліны. Па словах Юрыя Назарава, вырашаць кадравыя пытанні неабходна не толькі адміністрацыйным рэсурсам — важна і матывацыя людзей. «Планы на 2023 год у вобласці амбіцыйныя. Рэсурсы ёсць. Трэба падцягнуць проста дысцыпліну. У цэлым эканоміка за першы квартал мае станоўчыя тэндэнцыі. На мой погляд, характар работы, якая праводзіцца кіраўніцтвам вобласці, дынаміка выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы і папярэднія вынікі пачатку года выклікаюць асцярожны аптымізм. Упэўнены, што гэты ключавы год, які вы пазначылі для кіраўніцтва вобласці, дасць свае вынікі. Для гэтага ёсць практычна ўсё», — далажыў Юрый Назараў.

Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся, якія праблемы Юрый Назараў лічыць асноўнымі ў рэгіёне. «Самая галоўная праблема — «разбэшчанасць», — адказаў чыноўнік. На што кіраўнік дзяржавы заўважыў, што гэты яшчэ мяккі выраз».

Прэзідэнт падкрэсліў, што, нягледзячы на аб'ектыўныя прычыны, у большасці праблем вінаватая і разбэшчанасць. «Разгільдзяйства, злачыннасць, крадзеж — гэта ўсё ў кучу. І ніхто не нясе нібы адказнасць. А несці адказнасць трэба. І зноў паўстала пытанне стварэння сістэмы кіравання кадрамі», — заўважыў кіраўнік дзяржавы. У якасці прыкладу ён прывёў кадравы рээстр, згодна з якім Прэзідэнт узгадняе назначэнне цэлага шэрагу кіраўнікоў, у тым ліку старшынь райвыканкамаў. І без яго ведама вызваліць іх ад пасады нельга. Аляксандр Лукашэнка патрабуе, каб такі пералік кадраў быў і на ўзроўні вобласці, раёна і далей па вертыкалі, аж да механізатара. Таксама Прэзідэнт звярнуў увагу, што за кадравай дысцыплінай на месцах павінны сачыць і праваахоўныя органы.

Аляксандр Лукашэнка згадаў, што на гэтым тыдні правёў «інспекцыю без гальштукаў» на палях Магілёўскай і Віцебскай абласцей. Як ён заўважыў, там, дзе Прэзідэнт бывае кожны дзень, на поле люба-дорага паглядзець. А чаму на астатніх палях гэтага не робіцца? Дзесьці каля меліяратыўнага канала пакідаюць без увагі вымаклыя ўчасткі, яны зарастаюць, і пасля на іх аднаўленне патрэбны вялікія грошы. Дзесьці трактар пакідае неапрацаваныя часткі поля. «Сёння метры пакінулі, заўтра — кіламетры — і поле загублена. Чаму так адбываецца? Адказнасці няма. І я разумею, што на гэтым полі кіраўнік гаспадаркі ніколі не быў і аграном

# ПАЧЭСНАЕ МЕСЦА Ў ГЭТЫМ СВЕЦЕ»

не быў. Як так?» — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. Ён настойвае на тым, што ад людзей трэба атрымліваць вынік, а для гэтага патрэбна жалезабетонная дысцыпліна. ***«Калі кіраўнік будзе гарэць на працы — тады будзе толк»***, — упэўнены беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, з чаго пачаліся праблемы ва Украіне. Па яго словах, гэта была найбагацейшая краіна, але яе «разбэсцілі». У іх было ўсё. І ў прамысловасці, і асабліва ў сельскай гаспадарцы, чарназёмы і гэтак далей. «Калі б гэта нам, мы б лепш, чым Эміраты, развіваліся. А пачалося ўсё з таго: кіравальнасць страчана, рынак усё адрэгулюе, безгаловыя кіраўнікі... І пайшло-паехала. Карупцыя, хабары на ўсіх узроўнях, дзяльба ўласнасці, усё парэзалі, раздалі». Няма краіны. З гэтага ўсё пачалося. У гэтым асноўная прычына. А для таго каб знайсці вінаватых, пачалі рускую мову, рускамоўнае насельніцтва ціснуць, цкаваць. Як у нас падчас Шушкевіча, Пазняка. Нацыяналізм у нас жа таксама тады пачаў захлістваць краіну. А ў іх ужо захліснула. Зразумела, тады і суседзі глядзяць на цябе, паціраючы рукі. І іншае, і іншае. Вось з чаго пачыналася», — расказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што, калі ў краіне забяспечана моцная эканоміка, можна не перажываць за ваенную бяспеку: «Таму я заўсёды гавару: дайце эканоміку, дайце мне сацыяльна-эканамічнае становішча, і я з вас не буду пытацца за абарону. Гэта асабліва важна для вас. Вы ж бачыце, што адбываецца. Да вас шмат людзей прыехала, сваякоў там шмат», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. ***Ён звярнуў увагу, што супраць краіны, у якой ёсць сіла, адзінства людзей, эканоміка, не змогуць развязаць вайну. «Таму што лепш я з вас цяпер запатрабую, чым заўтра дам вінтоўку і пашлю на фронт»***, — дадаў кіраўнік дзяржавы.

А для таго, каб забяспечыць усё вышэйназванае, неабходныя моцныя кадры, дысцыплінаваныя і адказныя. Каб яны эфектыўна працавалі, павінна быць створана адпаведная сістэма. Адміністрацыі Прэзідэнта было даручана стварыць заканадаўчыя асновы адпаведнай сістэмы. «Я праверу, так гэта ці не. І мне далажыце ў найбліжэйшы час. І будзе патрабаванне з урада і губернатараў жалезабетоннае. Паўтараць па 10 разоў я не буду. Мы ўжо дажыліся да таго: Прэзідэнт, выпрацуй ідэю, пераспі з ёй, груба кажучы, давядзі да кожнага, а потым ідзі сам зрабі, а мы будзем збоку глядзець. Хлопцы, гэты час скончыўся. Зразумейце вы, нарэшце, калі мы не зробім цяпер гэта, нашы дзеці не зробяць. Яны іншыя», — папярэдзіў Прэзідэнт. Ён папрасіў маладых людзей не крыўдзіцца на яго. Па яго словах, сярод моладзі ёсць дасведчаныя, адказныя людзі. Але хапае і тых, хто «думае, што ў інтэрнэце яблыкі і грушы растуць». «Сядзяць, тыкаюць у гэты тэлефон — заўтра з неба ўсё зваліцца. Мы іх разбэсцілі да крайняй ступені. Ах, моладзь у нас добрая, добрая! Так, добрая. Але працаваць не хочуць і не ўмеюць. Яны не зробяць, яны не ўтрымаюць краіну», — перажывае кіраўнік дзяржавы.

Таму, яшчэ раз паўтарыў свой тэзіс Прэзідэнт, для таго, каб вырашыць тысячы пытанняў, якія сёння вострa стаяць перад краінай, трэба выпрацаваць сістэму, асабліва з кадрамі.

## «РАДУЙЦЕСЯ, ШТО САНКЦЫІ ЎВЯЛІ. АСАБЛІВА АГРАРЫІ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў сваіх выступленнях на нарадзе ні губернатар Гомельскай вобласці, ні ўпаўнаважаны па рэгіёне ўвогуле не гаварылі пра санкцыі. Ён станоўча ацаніў гэты факт. «А ў Гродне мне пра санкцыі пачалі гаварыць. Ды вы радуйцеся, што гэтыя санкцыі ўвялі. Асабліва аграрыі. У нас краіна нямала атрымлівае ад аграрнага сектара. Вязіце, прадавайце.

Прэзідэнт заклікаў усіх не спаць, а рухацца. І пры гэтым забыць пра санкцыі. «Галоўнае ў нашай сустрэчы — ***не надумайце шукаць аб'ектыўныя прычыны. Не надумайце! Няма аб'ектыўных прычын. Нікому сёння не лёгка. Але калі мы вытрымаем, мы будзем зусім іншымі і зоймем сваё пачэснае месца ў гэтым свеце»***, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

***Падчас нарады кіраўнік дзяржавы акрэсліў некалькі момантаў, якія трэба вырашаць неадкладна. «Калі губернатар і ўрад не гавораць аб гэтым, давядзецца мне гаварыць. Хоць гэта ўзровень абл-выканкама і старшыні райвыканкама», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.***

**• Сітуацыя на палях**

Па словах кіраўніка дзяржавы, на палях сталі працаваць лепей, чым у мінулыя гады, бо зразумелі, што лепей у полі, чым на фронце. Лепш, чым у мінулыя гады. Але праблем застаецца маса. Кіраўнік дзяржавы прывёў прыклад з уласных назіранняў: у сем гадзін вечара тэхніка ўжо ад'язджае з поля. ***«Трэба да цемры працаваць. Пасяўная кампанія кароткая, але ад гэтага залежыць увесь год. Раней насенне пакладзеце ў зямлю — будзе вынік»***, — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама закрануў пытанні меліярацыі. Ён падкрэсліў, што дзяржава выдаткавала грошы на буйныя работы, але дробнымі, так званай культуртэхнікай, павінны займацца самі гаспадаркі. Ён таксама параіў падключыць і прамысловыя прадпрыемствы. «Што, «Гомсельмаш» сёння хмызы на тысячы гектараў не высеча? Трэба падключыцца, выратаваць землі. У нас не хапае зямель, мы іх асушаем, а ў той жа час гробім там, дзе трэба працаваць і атрымліваць прадукцыю», — заўважыў беларускі лідар. — Таму меліярацыя меліярацыяй, а там, дзе можна з сякерай, рыдлёўкай папрацаваць, — гэта асобна».

Прэзідэнт звярнуў увагу на палявыя дарогі — палосы, па якіх перамяшчаецца тэхніка па палях. Ён запатрабаваў, каб да гэтага пытання ў гаспадарках ставіліся з асаблівай педантычнасцю. «Ляціш над краінай — тысячы гектараў азімых і травы выведзены са строю. Жудасна глядзець. У вас павінна быць схема палявых дарог», — запатрабаваў ён. Кіраўнік дзяржавы даручыў аднавіць контуры палёў: «Гэта культура земляробства. За гэта спытаем жалезабетонна».

**• Аб старых і новых фермах**

«Прыбірайце старыя будынкі і ўводзьце ў севазварот новыя ўчасткі. Пры фермах усё павінна быць да кутка апрацавана. Нідзе не павінна заставацца ні метра неапрацаванай глебы. На іх пустазелле расце і распаўсюджваецца па ўсім полі — а гэта недабор ураджаю», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, у перспектыве ўсё будзе выводзіцца са старых ферм, а на іх месцы будуць стварацца новыя комплексы. Аляксандр Лукашэнка даручыў узяць укамплектаванне ферм жывёлай на асобны кантроль. «Навошта мы гэтыя «палацы» пабудавалі і не ўкамплектавалі? А калі ўкамплектавалі, то доім, што каза больш малака дае, чым карова», — заўважыў ён. Аляксандр Лукашэнка заявіў, што штурмам трэба браць будаўніцтва малочнатаварных комплексаў з поўным тэхналагічным цыклам.

**• Аб прысядзібных участках**

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў будучыні усе людзі ў сельскай гаспадарцы будуць сканцэнтраваны ў аграгарадках і ў вялікай гаспадарцы будзе максімум дзве буйныя вёскі. Адбываецца ўрбанізацыя, і людзі ўсё больш хочуць жыць у нармальных умовах, а гэта аграгарадок.

Але, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, сёння ў любой вёсцы, малой ці вялікай, ёсць кінутыя прысядзібныя ўчасткі, а гэта ж урадлівыя землі, якія з часам зарастаюць хмызняком. «Давайце іх выратуем, апрацуем. Адзін раз апрацаваць і пасадзіць сады», — прапанаваў рашэнне праблемы кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, пакуль у вёсках жывуць людзі, іх трэба развіваць, каб яны не лічыліся неперспектыўнымі. «Для нас важна затрымаць людзей у гэтых вёсачках. Трэба, каб прыехалі тыя, хто нарадзіўся там, бізнесмены пабудавалі там сабе жыллё, узялі гэты прысядзібны ўчастак», — адзначыў беларускі лідар. Ён заклікаў беларусаў карыстацца гэтай магчымасцю: ***«Вы знаходзіцеся ў цэнтры Еўропы, на скрыжаванні ўсіх шляхоў. Вазьміце гэты ўчастак, але апрацуйце. Гэта багацце чалавека — мець паўгектара зямлі ў цэнтры Еўропы»***.

**• Аб будаўніцтве цяпліц**

Па словах Прэзідэнта, вельмі дрэнна, што вясной няма магчымасці накарміць народ сваімі агуркамі і памідорамі. «На працягу — будучага года гэту праблему трэба вырашыць. Што такое сёння пабудаваць гэтыя цяпліцы? Мы ж гэта ўсё ўмеем рабіць самі», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка. Пры гэтым, па яго словах, не трэба штампаваць цяпліцы, іх трэба будаваць у тых гаспадарках, дзе ўмеюць з імі працаваць або дзе для гэтага ёсць магчымасці. У працяг тэмы Прэзідэнт звярнуў увагу на сады. «Штурмам трэба выкарчоўваць старызну і ствараць новыя сады. Гэта не справа, што мы яблык завозім. Мы што, самі не можам, як у Польшчы, вырасціць гэты яблык? Можам. Проста не займаемся. А гэта імпартазамяшчэнне», — заўважыў Прэзідэнт.

Падводзячы рысу, Аляксандр Лукашэнка паўтарыў, што кадры вырашаюць усё. ***«У кіраўніка любога ўзроўню павінна быць улада, жалезная. І яны ні на кога не павінны азірацца. Меры павінны быць ваенныя, самыя жорсткія. Не чакайце асобных указанняў. І ў аснове ўсяго — дысцыпліна»***, — падсумаваў Прэзідэнт.

## «ДЗЕ ІШЛІ — ТАМ БЕГЧЫ ТРЭБА, ДЗЕ БЕГЛІ — ЯШЧЭ ХУТЧЭЙ БЕГЧЫ»

Кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу, што кожны павінен на сваім месцы закруціцца. Асабліва ў Гомельскай вобласці. «Хлопцы, вайна на фронце фактычна. Захавайце краіну. Гэта ўжо не толькі і не столькі для мяне. Гэта трэба вам. А захаваць мы яе можам, толькі калі напружыцца ўсім разам і вырашыць праблемы. ***Слухайце, а нам і напружвацца не трэба. Трэба проста каб кожны на сваім кавалачку, на сваім кутку рабіў сваю справу — і будзе вынік. Трэба ўзмацніць гэтыя тэмпы: дзе ішлі — там бегчы трэба, дзе беглі — яшчэ хутчэй бегчы»***, — заклікаў ён.

Прэзідэнт заўважыў, што Беларусі няпроста — там вайна, там НАТА і іншае: «Я не проста сюды ядзерную зброю цягну. Засцерагчы трэба краіну, каб глядзець баяліся ў наш бок. У адваротным выпадку зноў будзем пад ботам нечым хадзіць. Я хачу, каб вы гэты пасыл перш за ўсё ўспрынялі ад мяне. Гэта не нагнятанне абстаноўкі. Што тут нагнятаць? Вы лепш за мяне ведаеце, што адбываецца», — адзначыў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў Беларусь заўсёды з задавальненнем прыязджалі грамадзяне суседніх краін. Але цяпер «мярзотнікі закрылі мяжу». «Забетанавалі, замініравалі — ні праехаць, ні прайсці. Але гэта іх праблема. Яны ўжо людзей сюды не пускаюць. Палякі, літоўцы закрываюць прапускныя пункты, ствараюць праблемы, перш за ўсё для сваіх людзей, каб яны да нас не ехалі. Таму што, вяртаючыся ад нас, яны гавораць: «Вы што, звар'яцелі, чаго вы з беларусамі мірна не жывяце?» Значыць, гэта ўжо ў палітыку перарастае», — упэўнены ён.

У такой сітуацыі Прэзідэнт заклікаў усіх сабрацца, дзе толькі можна нешта зрабіць. «Я спадзяюся, што па выніках года ў нас будзе з вамі нармальная размова. Вельмі б хацелася, каб Гомельшчына была, як заўсёды, моцнай, мужнай. Збярыцеся проста», — рэзюмаваў беларускі лідар.

## «БУДЗЕ ВАМ МІР, НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ. ГАДУЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ. ПАЖАДАНА БОЛЬШ»

Пасля нарады Аляксандр Лукашэнка ізноў сустрэўся з жыхарамі Веткі. Гэтым разам павіталіся з кіраўніком дзяржавы захацела яшчэ больш людзей. «Мы павінны дадаць сёлета, каб у Гомельскай вобласці ў цэлым людзі жылі лепш. Ёсць куды імкнуцца. Ну, а вам дзякуй за цярпенне. Вы проста малайцы. Я вось адчуваю, наколькі беларусы, асабліва тут, на поўдні, — Гомельшчына, Брэстчына, паколькі гэта прыфрантавыя вобласці, — наколькі людзі ўжо пачалі шанаваць жыццё. Дайце толькі мір! ***Будзе вам мір, не хвалюйцеся. Галоўнае, каб вы спакойна працавалі, гадавалі сваіх дзяцей»***, — звярнуўся Прэзідэнт да мясцічаў.

***«У мяне таксама ёсць дзеці. І вы ўсе мае дзеці. Я не хачу, каб мне давялося вас пасылаць кудысьці на фронт. Таму супакойцеся, працуйце спакойна.*** Ніхто на нас нападаць не збіраецца. У тым ліку ўкраінцы. Ды і заходнікі, з якімі я сустракаюся, мне кажуць: «Аляксандр Рыгоравіч, спадар Прэзідэнт, да вас ні ўкраінцы, ні палякі не збіраюцца». Можа, і не збіраюцца. Але нам трэба быць гатовымі да ўсяго. Таму гадуйце дзяцей. Пажадана пабольш», — сказаў Прэзідэнт, а людзі зноў адказалі яму апладысментамі.

**Валерыя СЦЯЦКО,**
*г. Ветка.*

# Мінск павінен выйсці ў лідары па выкананні прагнозных паказчыкаў

**Такую задачу па выніках першага паўгоддзя на сустрэчы з кіраўніцтвам сталіцы паставіла Наталля Качанава**

**Цяпер жа сталіца, як паказалі вынікі ацэнкі работы за першы квартал, знаходзіцца на апошнім месцы па выкананні прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця. Пры гэтым ёсць шмат паказчыкаў, па якіх Мінск можа быць узорам для іншых рэгіёнаў (зыходзячы з вынікаў сацыялагічнага апытання) па задаволенасці магчымасцю працаўладкавання, арганізацыі адпачынку, работы аб'ектаў гандлю, харчавання, бытавых службаў, устаноў культуры, грамадскага транспарту, наяўнасцю веладарожак. Аднак існуюць у сталіцы праблемы ў рабоце ЖКГ, хуткай дапамогі, у наяўнасці асартыменту ў аптэках, рабоце дашкольных і школьных устаноў, арганізацый сацыяльнай абароны. А самае горшае — у сталіцы найменш, чым дзе, давяраюць органам улады. Усе гэтыя пытанні павінны быць вырашаны кіраўніцтвам горада, падкрэсліла Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі, на сустрэчы з актывам Мінска.**

Сёння ў Мінска не можа быць ніякіх прычын, каб ён цягнуўся ў хвасце ў справе развіцця рэгіёнаў. Тут мноства працоўных рэсурсаў (арганізацыі і прадпрыемствы), практычна ўвесь навуковы патэнцыял (НАН, шматлікія інстытуты). Сродкі на вырашэнне пытанняў ёсць, патрэбна толькі ініцыятыва кіраўніцтва сталіцы, перакanана Наталля Качанава:

— Па аб'ектыўных прычынах мы не можам быць на апошнім месцы, і мы павінны працаваць на два крокі наперад — тады будзе зусім іншы вынік. Займіцеся адрасоўкай сацыяльна-эканамічных параметраў. Кожная адміністрацыя сталіцы — гэта бадай што асобна ўзяты рэгіён. Неабходна актыўна працаваць з прадпрыемствамі, якія знаходзяцца на тэрыторыі адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі сталіцы.

Пустыя плошчы, якія знаходзяцца на іх тэрыторыях, трэба задзейнічаць, бо ў сталіцу прыйдуць інвестары, і яны будуць ствараць вытворчасці, патрэбныя гораду. Выкананне прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця фарміруе бюджэт, які заўтра можа быць скіраваны на вырашэнне сацыяльных задач. Таму ў выкананні паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця павінна прысутнічаць комплекснасць, каб дасягаўся не нейкі пэўны, а ўсе даведзеныя. ВРП, інвестыцыі, рост заработнай платы, будаўніцтва, экспарт паслуг — першасныя задачы, за якімі эканоміка, і ўжо за ёй — вырашэнне сацыяльных задач.

Абсалютна іншай павінна быць і работа сістэмы ЖКГ, прыйшла да высновы старшыня верхняй палаты, ацэньваючы работу са зваротамі грамадзян, бадай што палова якіх датычыцца менавіта гэтай сферы:

— Чалавек не так балюча ўспрымае праблемы са здароўем, як адсутнасць святла ў кватэры, недахоп цяпла ці нядобраўпарадкаваны двор. А гэтыя пытанні і фарміруюць узровень даверу да ўлад. Неабходна зусім іншым чынам працаваць з людзьмі — арганізаваць старэйшага па пад'ездзе ці доме. І гэта будуць органы самакіравання, з якімі будзе працай працаваць уладзе.

Мінск павінен быць ідэальным, лічыць Наталля Качанава. У прыватнасці, раздзяляльныя палосы на цэнтральных праспектах сталіцы мусяць мець роўныя агароджы і расліннае аздабленне, а кантэйнерныя пляцоўкі — размяшчацца так, каб нікому не замінаць. Робячы рамонт праезнай часткі, можа, недзе трэба і бетон палажыць, а не асфальт, і пліткавае пакрыццё — мяняць толькі там, дзе гэта дакладна неабходна, а не мяняць добрае на лепшае, падкрэсліла спікер. Агучаныя пытанні — не дробязі, а ўсё тое, што стварае незадаволенасць або задаволенасць людзей.

**Ірына СІДАРОК.**

*Больш падрабязна пра пытанні, якія абмяркоўвала Наталля Качанава на сустрэчы з кіраўніцтвам Мінска, мы раскажам у наступным нумары «Мясцовага самакіравання».*

# ГАЛОЎНАЙ МЭТАЙ ЗАСТАЮЦЦА АЛІМПІЙСКІЯ ГУЛЬНІ

## Шчырыя адказы на балючыя спартыўныя пытанні

**Нацыянальны форум атлетаў трэці раз сабраў у штаб-кватэры НАК Беларусі спартсменаў, трэнераў, функцыянераў і экспертаў з Беларусі і Расіі. Спорт па праве называюць універсальным сродкам зносін, а зносіны у самім спорце, як правіла, будуюцца на адкрытасці і шчырасці. Звяртаючыся да ўдзельнікаў форуму, прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь Віктар ЛУКАШЭНКА падкрэсліў, што дзякуючы такім зносінам спартыўныя чыноўнікі ведаюць, чым дыхаюць спартсмены і ў якім напрамку трэба рухацца. Прэзідэнт НАК Беларусі заявіў, што, нягледзячы на адхіленне спартсменаў і іншыя цяжкасці, галоўнай мэтай застаецца ўдзел у Алімпійскіх гульнях 2024 года ў Парыжы. Таму зверыць гадзіннікі і разам вызначыць, у якім напрамку рухацца, асабліва важна. Выконваючы галоўныя задачы Нацыянальнага форуму атлетаў, беларускія і расійскія спартсмены расказалі, чым дыхаюць і што іх хвалюе. Падчас экспертнай дыскусіі яны адказалі на самыя злабадзённыя пытанні.**

***Пытанне 1. Як рэагаваць на неадназначныя заяўленні Міжнароднага алімпійскага камітэта і рэкамендацыі, пры выкананні якіх беларускія і расійскія спартсмены могуць вярнуцца на міжнародныя турніры?***

«Умовы, якія прад'явіў МАК, на мой погляд, непрымальныя, але трэба прымаць да ўвагі іншыя рэчы. Мы правялі аналіз і ўбачылі, што колькасць дзяцей, якія займаюцца тэнісам, напрамую залежыць ад выступленняў нашых вядучых тэнісістаў. Я лічу, што нашы спартсмены павінны прадстаўляць нашу краіну, таму што гэта напрамую ўплывае на наш падмурак — дзіцячы спорт. Нашы спартсмены ў любым статусе паказваюць дзецям, што нават у складаных умовах можна дабіцца высокіх вынікаў», — адзначыў **Сяргей РУТЭНКА, старшыня Беларускай федэрацыі тэніса**.

**Трохразовая алімпійская чэмпіёнка па сінхронным плаванні Ала ШЫШКІНА** заўважыла, што Расія больш за 25 гадоў з'яўляецца лідарам сусветнага сінхроннага плавання. Па яе словах, за гэты год упаў узровень чэмпіянатаў Еўропы і свету, бо без лідара маляўнічасць і яркасць гэтага спорту пацьмянела. Узнімалася пытанне, ці варта змагацца за ўдзел у Алімпійскіх гульнях альбо лепей праводзіць альтэрнатыўныя спаборніцтвы, дзе ўсё будзе пабудавана на сумленнай справядлівай барацьбе. Ала Шышкіна заўважыла, што тут сітуацыя дваякая: «Пайсці і абарваць сувязі — гэта самае лёгкае, што можна зрабіць. Варта працягваць змагацца. Я ўпэўнена, што трэба весці дыялог. Калі ёсць магчымасць праводзіць паралельныя старты, то чаму не, калі гэта не будзе супярэчыць нашаму ўдзелу ў сусветным алімпійскім руху».

***Пытанне 2. Наколькі беларуска-расійскія старты сталі альтэрнатывай міжнародным?***

**Лідар беларускага канькабежнага спорту, прызёр кубкаў свету Ігнат ГАЛАВАЦЮК** заўважыў, што ў гэтым сезоне каманда адчувала вялікую канкурэнцыю ад расійскіх таварышаў. А маладым беларускім канькабежцам сумесныя турніры далі вялікі вопыт і паказалі, да якога ўзроўню трэба імкнуцца, паколькі ў Расіі шмат рэкардсменаў, прызёраў і чэмпіёнаў вядучых турніраў. Хаця, як прызнаўся Ігнат, вопытным спартсменам, якія пабачылі Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету, хочацца адчуць дух барацьбы з рознымі сапернікамі, паколькі гэта павялічвае матывацыю.

***Пытанне 3. Ці не ўпадзе ўзровень беларускіх і расійскіх спартсменаў пасля вяртання на міжнародную арэну?***

«Галоўнае, каб узровень скандынаваў, не дай бог, не ўпаў», — іранічна заўважыла **намеснік старшыні камісіі спартсменаў НАК Беларусі біятланістка Людміла КАЛІНЧЫК**. Яна падкрэсліла, што ў гэтым сезоне ва ўдзельнікаў міжнародных спаборніцтваў па біятлоне не было такіх моцных сапернікаў, як Антон Смольскі, Дзінара Алімбекава-Смольская, Эдуард Латыпаў, якія заўсёды давалі бой. «На працягу ўсяго сезона нашы спартсмены паказвалі стабільнасць і прафесіяналізм. Сумесны Кубак садружнасці паказаў, што нашы біятланісты не страцілі матывацыю, а іх дух перамогі стаў яшчэ мацнейшым. Калі сітуацыя вырашыцца, мы абавязкова ўбачым сваіх спартсменаў на п'едэстале», — адзначыла Людміла Калінчык.

Ала Шышкіна звярнула ўвагу, што самі спартсмены ў многіх відах хочуць, каб беларусы і расіяне вярнуліся на міжнародную арэну. Яна прывяла нядаўні вельмі красамоўны прыклад з плавання. Расіянка Яўгенія Чыкунова аднавіла сусветны рэкорд на дыстанцыі 200 метраў брасам — 17,55 секунды. «Так, так, так! Ты проста разграміла яго, дзетка. Мае віншаванні! Як бы я хацела моцна абняць цябе», — так спартсменку ў сваіх сацыяльных сетках павіншавала алімпійская чэмпіёнка з ПАР Таццяна Скунмакер, былая ўладальніца гэтага рэкорду.

Сяргей Рутэнка ў працяг тэмы нагадаў словы Прэзідэнта аб тым, што ні адзін дыпламат не робіць столькі, колькі спартсмен, які падымаецца на першую прыступку п'едэстала. Ёсць над чым падумаць.

***Пытанне 4. Як цяпер утрымліваць матывацыю і дзе яе шукаць?***

Асабліва гэта пытанне актуальнае для відаў спорту, якім ужо прыадчынілі дзверы на міжнародную арэну. Нядаўна такая добрая навіна прыйшла і да барцоў. «Мы арганізавалі працу так, што нашым спартсменам няма калі апамятацца і думаць, што ім не хапае стартаў. Натуральна, бракуе канкурэнцыі, ёсць жаданне пабароцца з рознымі сапернікамі. Нашы спартсмены да гэтага гатовы максімальна», — расказала **Васіліса МАРЗАЛЮК, старшы трэнер нацыянальнай каманды па барацьбе**.

Проста ў гэтым годзе не было нікому. Але арганізаваць спаборніцтвы і вучэбна-трэніровачныя зборы барцам лягчэй, чым, напрыклад, фрыстайлістам. **Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па фрыстайле Міхаіл КУРЛОВІЧ** расказаў, што сёлета жыццё камандзе ўскладніла адсутнасць прывычных умоў для трэніровак, большасць баз знаходзяцца за мяжой. Па яго словах, упершыню ў гісторыі спартсмены пачалі трэніраваць скачкі ў сярэдзіне студзеня, на два з паловай месяцы пазней, чым звычайна. «Наконт матывацыі — у фрыстайле ёсць такі выраз: «пераможаш сябе — пераможаш увесь свет». Трампліны не даруюць слабасці — нездарма фрыстайл лічыцца самым экстрэмальным відам спорту ў алімпійскай праграме. Каманда ў нас маладая, перспектыўная, мы азначылі шлях, якім будзем ісці ў цяперашняй сітуацыі. Прырода стварае алмазы пад найвышэйшым ціскам, і мы справімся», — падзяліўся Міхаіл Курловіч. Зараз фрыстайлісты рыхтуюцца да наступнага сезона, не ведаючы, як ён будзе праходзіць. І нявызначанасць, па словах галоўнага трэнера, — самае цяжкае.

***Пытанне 5. Якія новыя магчымасці для беларускіх і расійскіх спартсменаў адкрывае цяперашняя сітуацыя?***

Як заўважыў **рэктар Расійскага міжнароднага алімпійскага ўніверсітэта Леў БЕЛАВУСАЎ**: «Няма ліха без дабра. Стала менш спаборніцтваў, але стала больш часу. Трэба скарыстацца гэтай магчымасцю, каб забяспечыць сваю будучыню. У сусветнай адукацыі гэта завецца «паралельнай кар'ерай». І вы можаце яе рабіць, застаючыся дзеючым атлетам, паглыбіцца ў адукацыйны працэс. Немагчыма стаць добрым кіраўніком, калі ты проста добры спартсмен. Трэба шмат ведаць, умець і карыстацца назапашаным досведам».

Па словах Льва Белавусава, любое пачынанне складаецца з трох этапаў: першы — задумацца, другі — зрабіць выбар, трэці — зрабіць. «У вас сёння ёсць усе магчымасці, трэба проста іх убачыць і зрабіць для сябе выбар. І калі прыйдзе час пакінуць п'едэстал, вы не ўніз пойдзеце, а — убок і застаняцеся ў спартыўнай індустрыі», — звярнуўся рэктар РМАУ да ўдзельнікаў форуму. Дарэчы, за некалькі гадоў вучобу ў Расійскім міжнародным алімпійскім ўніверсітэце прайшлі больш за 200 беларусаў.

**«Не можа існаваць спорт у нейтральным статусе»**

Праз усю дыскусію чырвонай стужкай праходзіла адно пытанне — што рабіць спартсменам, як працаваць ва ўмовах, калі іх жыццё кардынальна змянілася. Прыгожую кропку ў гэтых разважаннях паставіла **бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў па мастацкай гімнастыцы Любоў ЧАРКАШЫНА**: «Я да гэтага часу памятаю свае слёзы на Алімпійскіх гульнях. Я стаяла тады на трэцім месцы з бронзавым медалём. Не было ў мяне магчымасці спяваць гімн, стоячы на першым месцы. Я спявала яго ўнутры сябе, гледзячы на свой сцяг, — гэта дарагога варта. І мяне могуць зразумець толькі тыя, хто стаяў на п'едэстале, хто бачыў свой сцяг і спяваў гімн сваёй краіны. Гэта немагчыма растлумачыць. Я разумею кожнага спартсмена, разумею, што гэта частка спорту, за якую кожны спартсмен трымаецца. Не можа існаваць спорт у такім нейтральным выглядзе. Ты павінен за нешта змагацца. Дзеля таго, каб праславіць сваю краіну, сваё імя, свой від спорту, каб увесь свет даведаўся пра тваю краіну.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



# ПРЫЗНАННЕ КІБЕРСПОРТУ

## Ігнараваць камп'ютарны спорт сёння немагчыма — варта яго прызнаць і падтрымаць

**Калі ў сучаснікаў Шэкспіра ўсё жыццё — тэатр, то ў нас — інтэрнэт. Узяць да прыкладу спорт. Турніры па баскетболе, лёгкай атлетыцы, гімнастыцы і іншых відах, якія праходзілі ў анлайн-рэжыме падчас пандэміі каранавіруса, увагай гледачоў абдзелены не былі, ды і вынікі спартсмены паказвалі нядрэнныя. Зразумела, што гэта была вымушаная мера. Але дзякуючы ёй традыцыйныя віды спорту даволі паспяхова сталі «кібер». А што перашкаджае кіберспорту стаць звыклым відам спорту? Так, нічога не перашкаджае. І кіберспорт — даўно ўжо паўнавартасная частка сусветнага спорту. Сёння ён афіцыйна прызнаны больш як у 60 краінах, у тым ліку і постсавецкіх. Што да Беларусі, то ў апошнія гады кіберспорт эфектна ўварваўся і ў яе спартыўнае жыццё.**

Упэўніцца ў гэтым можна было на міжнародным форуме ТІБА-2023, які на мінулым тыдні прайшоў у Мінску. На вялікім і стыльным сумесным стэндзе Беларускай асацыяцыі камп'ютарнага спорту і кампаніі А1 прайшло больш за 40 кіберспартыўных турніраў па 17 дысцыплінах. Кожны наведвальнік мог адчуць атмасферу буйных кіберспартыўных падзей. Прафесіяналы разгледзелі асноўныя аспекты развіцця сусветнай гульнявой індустрыі, а дылетанты ўбачылі, што гэта ўвогуле. Галоўнае, што абыякавым гэты стэнд нікога не пакінуў.

Сімвалічна, што кіберспорт прыцягваў увагу шматлікіх наведвальнікаў ТІБА-2023 у дні, калі яго галоўнаму рухавіку Беларускай асацыцыі камп'ютарнага спорту, заснаванай па ініцыятыве кампаніі А1, спаўняецца тры гады. Здаецца, дата невялікая, але за гэты час было зроблена шмат. Падвялі вынікі і акрэслілі планы на будучыню ўжо на другім мерапрыемстве — мітапе (нефармальнай сустрэчы) Беларускай асацыяцыі камп'ютарнага спорту, якая сёння аб'ядноўвае 25 арганізацый з усёй краіны.

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 мая 2023 г. до 17.00**

---

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полн. наименование: открытое акционерное общество

# «МАПИД»

Адрес: 220036, г. Минск, ул. Р. Люксембург, 205
Полное Ф.И.О. руководителя: Астрейко Леонид Иванович
Полное Ф.И.О. главного бухгалтера: Цыбульская Елена Владимировна
Основные виды деятельности: строительство
Единица измерения: тыс. руб.

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2022 года

| АКТИВ | Код. стр. | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| **I. Долгосрочные активы** | | |
| Основные средства | 110 | 150 417 |
| Нематериальные активы | 120 | 159 |
| Доходные вложения в материальные активы | 130 | 1 371 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 34 957 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 666 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 164 |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 1 576 |
| Прочие долгосрочные активы | 180 | 40 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **189 350** |
| **II. Краткосрочные активы** | | |
| Запасы | 210 | 74 211 |
| Долгосрочные активы, предназначенные для реализации | 220 | - |
| Расходы будущих периодов | 230 | 16 235 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 885 |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 48 130 |
| Краткосрочные финансовые вложения | 260 | - |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 9 667 |
| Прочие краткосрочные активы | 280 | 59 |
| **ИТОГО по разделу II** | **290** | **149 187** |
| **БАЛАНС** | **300** | **338 537** |
| СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | |
| **III. Собственный капитал** | | |
| Уставный капитал | 410 | 68 463 |
| Неоплаченная часть уставного капитала | 420 | - |
| Собственные акции (доли в уставном капитале) | 430 | - |
| Резервный капитал | 440 | 2 315 |
| Добавочный капитал | 450 | 101 064 |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 460 | 54 450 |
| Чистая прибыль (убыток) отчетного периода | 470 | - |
| Целевое финансирование | 480 | - |
| **ИТОГО по разделу III** | **490** | **226 292** |
| **IV. Долгосрочные обязательства** | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 4 623 |
| Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам | 520 | 1 152 |
| Отложенные налоговые обязательства | 530 | - |
| Доходы будущих периодов | 540 | 3 344 |
| Резервы предстоящих платежей | 550 | - |
| Прочие долгосрочные обязательства | 560 | 13 |
| **ИТОГО по разделу IV** | **590** | **9 132** |
| **V. Краткосрочные обязательства** | | |
| Краткосрочные кредиты и займы | 610 | 50 059 |
| Краткосрочная часть долгосрочных обязательств | 620 | 5 809 |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 46 484 |
| Обязательства, предназначенные для реализации | 640 | - |
| Доходы будущих периодов | 650 | 678 |
| Резервы предстоящих платежей | 660 | 83 |
| Прочие краткосрочные обязательства | 670 | - |
| **ИТОГО по разделу V** | **690** | **103 113** |
| **БАЛАНС** | **700** | **338 537** |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2022 г. по 31 декабря 2022 г.

| Наименование показателей | Код строки | За отчетный период |
|---|---|---|
| Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | 010 | 417 173 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | (385 978) |
| **Валовая прибыль** | **030** | **31 195** |
| Управленческие расходы | 040 | (10 001) |
| Расходы на реализацию | 050 | (1 000) |
| **Прибыль(убыток) от реализации продукции,товаров, работ, услуг** | **060** | **20 194** |
| Прочие доходы по текущей деятельности | 070 | 26 025 |
| Прочие расходы по текущей деятельности | 080 | (39 259) |
| Прибыль по текущей деятельности | 090 | 6 960 |
| Доходы по инвестиционной деятельности | 100 | 4 556 |
| Расходы по инвестиционной деятельности | 110 | (4 509) |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | (11 321) |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | (13 462) |
| **Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности** | **140** | **(2 094)** |
| Прибыль до налогообложения | 150 | 4 866 |
| Налог на прибыль | 160 | (4 043) |
| Изменение отложенных налоговых активов | 170 | - |
| Изменение отложенных налоговых обязательств | 180 | 341 |
| Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода) | 190 | - |
| Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | 200 | (11) |
| **Чистая прибыль** | **210** | **1 153** |
| Количество акционеров, всего | чел. | 8 066 |
| в том числе: юридических лиц | чел. | 3 |
| из них: нерезидентов Республики Беларусь | чел. | нет |
| в том числе: физических лиц | чел. | 8 063 |
| из них: нерезидентов Республики Беларусь | чел. | 11 |
| Доля государства в уставном фонде, всего | % | 92,20 |
| Начислено на выплату дивидендов за отчетный период | тыс. руб. | 1 928,926 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 0,17468415 |
| Обеспеченность акций имуществом Общества | руб. | 20,49 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | нет |
| Среднесписочная численность работающих | чел. | 5 262 |
| Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за отчетный год | 29 марта 2023 года | |
| Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | общее строительство зданий | |
| Сведения о применении эмитентом правил корпоративного поведения | применяются | |

Генеральный директор ОАО «МАПИД» Л.И.Астрейко

Главный бухгалтер ОАО «МАПИД» Е.В.Цыбульская

**Аудиторское мнение ООО «ФБК-Бел»**

За исключением влияния вопроса, описанного в разделе «Основание для выражения аудиторского мнения с оговоркой», прилагаемая годовая бухгалтерская отчетность достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «МАПИД» по состоянию на 31 декабря 2022 года, финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств за год, закончившийся на указанную дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

# АД МІСТЫКІ ДА МЕЛАДРАМЫ

## Чым жыве беларускі кінематограф

**У наступным годзе беларускае кіно адзначыць сваё 100-годдзе. І прыемна канстатаваць, што жыццё на «Беларусьфільме» працягвае віраваць. Тут здымаюць новыя стужкі, даюць пляцоўку для прафесійнага старту маладым, будуюць масты міжнароднага ўзаемадзеяння і вераць, што працяг будзе годны ў гэтай гісторыі. Пытанні развіцця кінематаграфічнай сферы ў Беларусі на сучасным этапе разгледзелі на адной з сустрэч з журналістамі прадстаўнікі кінастудыі.**

— За апошнія пяць гадоў, нягледзячы на ўсе цяжкасці, з якімі сутыкаецца свет, наша кінастудыя ўсё перааддольвае, выжывае і развіваецца. І мы ведаем, як і што рабіць далей для яе існавання. Сёння мы маем дакладнае бачанне сваёй стратэгіі. Хачу адзначыць, што на сёння не існуе прыкладу, якой павінна быць дзяржаўная кінастудыя. Мы за гады працы вывучылі розны вопыт і разумеем, што ў кожнай краіны свой шлях. І нам удаецца, прытрымліваючыся свайго бачання, рухацца наперад і знаходзіць сваё месца як у эканоміцы краіны, так і ў кінаіндустрыі ў цэлым, — адзначыў **генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ**. — За апошнюю пяцігодку мы неаднаразова перажывалі складаныя моманты (рэканструкцыя, пандэмія, знешне- і ўнутрыпалітычная сітуацыя), але працягвалі рухацца і ствараць кіно.

Пры гэтым важна разумець, што «Беларусьфільм» сёння — не проста арганізацыя, дзе ствараюць кіно, але і месца, дзе займаюцца яго прасоўваннем, папулярызацыяй, наладжваюць работу з маладымі спецыялістамі. Што датычыцца кінавытворчага працэсу, то сёння тут здымаюць дакументальныя, гульнявыя і анімацыйныя фільмы. Кінаработы прымаюць актыўны ўдзел у шматлікіх фестывалях і набываюць сваю аўдыторыю.

### «ПАДРЫЎ» — У ТОПЕ

Калі разглядаць сітуацыю запатрабаванасці беларускага кіно на ўнутраным кінарынку, то тут таксама можна знайсці станоўчае. Напрыклад, як распавёў **генеральны дырэктар камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Гомелькінавідэапракат» Аляксандр ЛАЎРЫНЕНКА**, у мінулым годзе ў кінатэатрах Гомельскай вобласці паказалі 515 фільмаў, з якіх 165 — беларускія.



— На жаль, колькасць новых беларускіх фільмаў не вельмі высокая, таму мы працуем з кінастужкамі мінулых гадоў. Так, у нас у топе беларускіх фільмаў **«Зоркі сёмага неба»** Алены Туравай на 2-3-м месцы, дзе ён дзеліць поспех з карцінай «Тум-Пабі-Дум» Вячаслава Нікіфарава. Альбо калі казаць пра нядаўна выпушчаныя «Беларусьфільмам» кінастужкі, то фільм «Падрыў» Івана Паўлава сярод названых мной 515 фільмаў у топе заняў 8-е месца па касавых зборах і 2-е месца па колькасці гледачоў, — дзеліцца Аляксандр Леанідавіч. — Самае галоўнае — там сабраны маладыя акцёры, якія, на мой погляд, шыкоўна спрацавалі. І атрымалі на выхадзе праект, які аказаўся цікавы для аўдыторыі і запатрабаваны ёю.

«Падрыў» — якраз адзін з тых прыкладаў, калі наглядна дэманструецца, што ў нас імкнуцца і ўмеюць здымаць якаснае, актуальнае кіно, што ёсць добры кадравы склад. Фільм актыўна падарожнічае па фестывалях, а расійскія партнёры кінастудыі плануюць яго паказ у шэрагу кінатэатраў на 9 мая. Таксама, па словах дырэктара кінастудыі, варта чакаць з'яўлення беларускіх дакументальных фільмаў на расійскім канале «Культура», на шэрагу інтэрнэт-платформ.

### ФІЛЬМ ПРА КОЛАСА ЗДЫМАЮЦЬ У ТАШКЕНЦЕ

Акрамя гэтага, «Беларусьфільм» арганізоўвае і садзейнічае правядзенню разнастайных мерапрыемстваў, сярод якіх кіналекторыі, кінасустрэчы, кінаклубы і кінаакцыі, Дні кіно і кінафестываль «Лістапад». Так, летась па даручэнні Міністэрства культуры кінастудыя праводзіла вялікую акцыю «Кінаўрокі гісторыі. Ідзі і глядзі», а цяпер плануецца яе працяг ужо ў партнёрстве з расійскімі калегамі. А на міжнародны кінафестываль «Лістапад» у 2022 годзе была пададзена найбольшая за ўсю гісторыі кінафоруму колькасць заявак, і гэта нягледзячы на санкцыі і іншыя крызісы.

Гатовыя і адкрытыя, па словах дырэктара кінастудыі, на «Беларусьфільме» і да міжнароднага супрацоўніцтва. У якасці прасторы для сумеснай працы тут разглядаюць не толькі Расію, але і краіны блізкага замежжа, еўрапейскі рынак, далёкае замежжа — накшталт Кітая, Індыі, Лацінскай Амерыкі:

— Сёння нашы фільмы можна знайсці ў тэлепракаце ці на інтэрнэт-платформах у вельмі далёкіх краінах. Летась з трыма фільмамі мы выйшлі на кітайскі рынак. У нас вядзецца актыўная работа з калегамі з Узбекістана, прычым мы не толькі прымаем удзел у Днях кіно, але і ўдзельнічаем у фестывалях адно аднаго, знаёмімся з іх спецыялістамі, вывучаем вопыт. Вядома, здараюцца творчыя праблемы, але мы рухаемся наперад, і цяпер у вытворчасці знаходзяцца нашы сумесныя фільмы — ігравы «Казбек» і дакументальны, прысвечаны Якубу Коласу (яго пачалі рабіць у год 140-годдзя з дня нараджэння класіка, і ў найбліжэйшыя месяцы будуць здымкі ў Ташкенце).

«Беларусьфільм» на сёння мае вялікую колькасць дагавораў з кінастудыямі розных краін свету. Таксама, дзякуючы ініцыятыве беларускага боку, у 2019 годзе быў створаны савет дырэктараў кінастудый краін СНД. За апошнія два гады беларуская кінастудыя садзейнічала стварэнню больш чым дзясятка фільмаў у краінах Сярэдняй і Цэнтральнай Азіі. Упершыню распачалося супрацоўніцтва з Індыяй, што дало і важкі грашовы прыбытак. Дазваляе зарабіць сёння і продаж маёмасных правоў, асабліва калі пашыраецца прысутнасць беларускага кіно як на YouTube-платформе, так і на шэрагу міжнародных пляцовак («Яндэкс», «Іві» і іншыя).

### РЭСТАЎРАЦЫЯ СТУЖАК І МУЛЬЦІКІ

А тая акалічнасць, што за апошнія гады кінастудыя палепшыла матэрыяльна-тэхнічную базу, робіць «Беларусьфільм» арганізацыяй поўнага цыкла, з якой выгадна працаваць дынамічна, празрыста і зручна. Ствараючы новае, тут клапоцяцца і пра захаванне ўжо існуючага, назапашанага прафесійнага вопыту і гатовага кінапрадукту. З мэтрамі, якія ў розны час працавалі на кінастудыі, ладзяцца сустрэчы і майстар-класы, а фільмам даюць новае жыццё. Кінастужкі праходзяць рэстаўрацыю і папаўняюць асартымент кінапракатчыкаў як у Беларусі, так і за мяжой. Прычым «ратуюць» (рэстаўрыруюць, алічбоўваюць, дубліруюць, даюць субцітры на замежных мовах) беларускую класіку кінамастацтва, арыентуючыся не толькі на ўзрост твораў, але і на запатрабаванасць іх у глядацкай аўдыторыі.

Калі казаць пра выхаванне гледачоў, то пра іх клапоцяцца з самага юнага ўзросту. Мяркую, менавіта таму мультыплікацыйныя фільмы, што выходзяць на «Беларусьфільме», спалучаюць у сабе не толькі прыгожую карцінку, але і годны змест. Сёння, на жаль, што датычыцца тэлебачання, то паказваюць нашы мульцікі ў тэлеэфіры толькі на канале «Беларусь 3», але для аматараў глядзець беларускае ёсць добрая прапанова ў інтэрнэтпрасторы. Кінапракатныя арганізацыі таксама актыўна і ахвотна працуюць з беларускай анімацыяй. У якасці прыкладу міжнароднага супрацоўніцтва ў дадзеным кантэксце можна згадаць праекты «Казкі старога піяніна» і **«Дзіцячы альбом»**,



які беларуская кінастудыя больш за дзесяць гадоў сумесна з расійскімі партнёрамі выпускае блокамі. Гарманічна ўплятаецца праца нашых аніматараў таксама і ў навучальны працэс: згадаць той жа буквар, што ўбачыў свет у 2021 годзе, дзе знаёмства з літарамі суправаджаецца мульфільмамі пра іх. Альбо калі засяродзіцца на змесце фільмаў для дзяцей розных узростаў, то яны знаёмяць сваю аўдыторыю са знакамітымі прадстаўнікамі беларускай культуры і грамадскага жыцця, даюць стымул для разважанняў і прастору для ўласных высноў. Згадайце «Класікі і шахматы», «Максім Багдановіч» і іншыя.

### ШТО ВЫБІРАЕ МОЛАДЗЬ

— Я сама, як глядач, у кінатэатры заўсёды чакаю падтрымкі. Кіно бывае рознае, і тэмы ў ім могуць падымацца самыя разнастайныя: як складаныя, так і сумныя, і нават трагічныя, але разам з тым фільмы не павінны пакідаць пачуццё безнадзейнасці. Чалавек пасля прагляду павінен атрымліваць, наадварот, станоўчы зарад, які дазволіць яму жыць далей, дасць сілы для змагання з абставінамі і натхніць дапамагаць тым, хто побач, — дзеліцца **рэжысёр, сцэнарыст, кіраўнік студыі маладзёжнага кіно «Смолка» нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» Алена ТУРАВА**. — Паўстае і другая праблема — як вярнуць гледача ў кінатэатры. Каб глядзелі не толькі замежныя фільмы, але і наш прадукт. Тут засяроджваецца трэба на рэкламе, прычым пачынаць работу ў гэтым кірунку яшчэ да выхаду фільма. Каб не было сітуацыі, што наша кіно крытыкуюць, нават не гледзячы. Вы разбярыцеся, паглядзіце, а потым вызначайцеся: спадабалася альбо не. Калі мы навучымся рабіць так, каб нас ведалі найперш у нашай краіне, калі пачнём паважаць сябе, то ў нас больш шанцаў, што нас з павагай будуць успрымаць іншыя.

На сучасным этапе «Беларусьфільм» працягвае арыентавацца на стварэнне кіно розных жанраў. Так, хто любіць містыку, той пойдзе на новую інтэрпрэтацыю «Чорнага замка Альшанскага» па рамане Уладзіміра Караткевіча, а іншыя дачакаюцца выхаду кінастужкі ў жанры меладрамы, камедыі ці баевіка. У кожнага твора, у тым ліку і для кінаэкрана, зайсёды знойдзецца свой глядач. Цікава назіраць і за маладымі рэжысёрамі, а іх імкнуцца падтрымліваць на кінастудыі і даваць прастору для творчага выяўлення. У працэсе здымак, напрыклад, знаходзіцца кінакамедыя дэбютанта Кірыла Халецкага. Распрацаваны праект «Гарадская казка» з пераможцамі маладзёжнага пітчынгу (праходзіў у рамках «Лістападу»), над якім будзе працаваць рэжысёр Дзмітрый Сарока. Яшчэ тры маладыя рэжысёры будуць працаваць над праектам пад рабочай назвай «Старонкі з агульнага сшытка», дзе плануецца аб'яднаць фільмы-прыпавесці. Па словах Алены Віктараўны, у кожным выпадку маладыя таленты робяць спробу праз свае фільмы заяўляць пра сябе, дэманструюць свае думкі і стыль.

### КІНО ПРА НАС САМІХ

Падсумоўваючы, можна сказаць, што, перш чым слухаць крытыкаў і меркаванні, мяўляў, беларускае кіно перажывае часы заняпаду, варта паглыбіцца ў тэму і прааналізаваць яе з розных бакоў. Можна бясконца аглядацца і спрачацца, у каго трава больш зялёная. І кожны, вядома, застанецца пры сваім. Але галоўнае — можа, нават авансам, але верыць і любіць сваё.

— Кінематограф здольны аказваць грандыёзны ўплыў на наша жыццё. А тэхнічныя ўмовы цяпер такія, што здымаць можа кожны і спрабуе тое рабіць. Іншае пытанне: што здымаць? Гэта пытанне сістэмнае, пытанне: выхавання і ўсведамлення таго, хто мы ёсць, што мы сабой уяўляем, — звярнуўся да прысутных **мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Тэатр-студыя кінаакцёра», кінарэжысёр, старшыня Савета па развіцці кінематаграфіі Аляксандр ЯФРЭМАЎ**. — Мяркую, менавіта гэта адно з актуальных пытанняў, якія ёсць на сучасным этапе развіцця нашага айчыннага кінематографа. Таму і адна з найважнейшых задач заключаецца ў тым, каб зразумець і ўсвядоміць, хто мы і што маем, якія праблемы стаяць перад нашым грамадствам і перад намі, яго грамадзянамі. І яе мы павінны вырашаць усе разам. Таму кінематограф, які мае зараз з'явіцца, павінен даследаваць нас саміх, расказваць пра нашу сучаснасць і яе праблемы. І натхняць на іх вырашэнне.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з сайта belarusfilm.by.**



# БЛЮЗ У БРОНЗЕ

## Гайд па скульптурах Аляксандра Фінскага разам з аўтарам



**Выстаўка скульптуры і графікі Аляксандра Фінскага ў Нацыянальным мастацкім музеі, прымеркаваная да 70-годдзя аўтара, атрымалася незвычайнай... І не толькі таму, што некаторыя экспанаты, выкананыя ў бронзе і дрэве, з дазволу аўтара адкрытыя для тактыльнага агляду — іншымі словамі, іх можна мацаць, гладзіць... Аўтар яшчэ і сам правёў экскурсію па сваіх работах. Многія з іх пазнавальныя, бо з'яўляюцца эскізамі да вядомых помнікаў. А такіх шмат... Аляксандр Фінскі — адзін з аўтараў мемарыяла «Яма. Мінскае гета», знака «Нулявы кіламетр» на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску, комплексу ў пасёлку Красны Бераг, прысвечанага дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны, помніка Сімяону Полацкаму ў Полацку, і гэта далёка не ўсё...**

**У чытачоў «Звязды» ёсць магчымасць здзейсніць падарожжа па скульптурах выстаўкі з каментарыямі аўтара.**

### ПРА СЯБЕ

«Адлічваць мой шлях у мастацтве можна з пятага класа Рэспубліканскай мастацкай школы, гэта 1971 год. Займаюся не толькі станковай скульптурай, у мяне шмат манументальных прац, помнікаў, мемарыяльных знакаў і ў Беларусі, і за яе межамі, у Кітаі, Германіі, у Маскве... Не ўсё ў манументальным мастацтве можна выказаць, таму што яно грамадскае, часта робіцца на замову. Як правіла, заказчык можа дыктаваць нейкія ўмовы, ты працуеш у пэўных рамках... Таму ў кожнага скульптара за жыццё назапашваюцца ідэі і думкі, якія ён не выказаў у манументальным мастацтве. Гэтая выстаўка, фактычна, — экскурс у такія выказванні, хоць большасць скульптур зроблены за апошнія два гады.

Я працую ў розных матэрыялах. Матэрыял для скульптара — суаўтар, калі ты разумееш яго пластычныя магчымасці. Калі не разумееш — ён будзе табе ворагам. Напрыклад, калі гэта дуб, тэхніка працы залежыць нават ад таго, якую частку дрэва бярэш. Часам скульптары, захапляючыся тэхнікай, забываюць пра пластыку, і механічны падыход не заўсёды ставарае жывую скульптуру — гэтаму, дарэчы, мы сярод іншага вучым у Акадэміі мастацтваў, дзе я даволі доўга ўжо выкладаю.

Што датычыцца графікі, якая прысутнічае на выстаўцы, яна ў мяне спецыфічная. Калі з'яўляюцца ідэі, не заўсёды пад рукамі пластылін ці гліна... А аловак ці ручка заўсёды ёсць. І ты фіксуеш ідэю ў малюнку. Але ўсе мае малюнкі ў перспектыве — скульптура. Ёсць тут і жывапіс, пастэллю часам малюю, алеем. Але гэта толькі дапаўняе творчую палітру».

### «МАКСІМ ТАНК»



«Гэта работа — прысвячэнне Максіму Танку. На ёй пазнака — «1936 год». Час быў смутны для паэта... Ён жыў у Заходняй Беларусі, у любы момант мог трапіць у польскую турму. Таму ён ідзе па шкле. Гэта сімвалізуе і лёд, на якім можна паслізнуцца, упасці... Гравіроўка па шкле нагадвае замець, калі снег ляціць па слізкім лёдзе. Я ўбачыў фота Максіма Танка ў гэткім картузе, і яно мяне закранула... Паэт нагадаў Маякоўскага. Потым неяк я гаварыў з сынам Максіма Танка, і аказалася, што ў Танка сапраўды любімы паэт быў Маякоўскі».

### «УЛАДЗІМІР МУЛЯВІН. КРЫК ПТУШКІ»



«Усе ведаюць песню Уладзіміра Мулявіна на словы Юрыя Рыбчынскага «Крык птушкі» пра чараўніка, які за здраду ператварыў каханую ў птушку... Гэтая песня і стала тэмай скульптурнай кампазіцыі. Не такі ўжо Уладзімір Мулявін быў улюбёнец лёсу, як усе ўяўляюць. Я яго не раз бачыў, нават неяк размаўляў, хоць блізка знаёмыя не былі. І для мяне ён трагічны чалавек. Яму было вельмі цяжка, жыццё не было для яго вялікім святам. Зрэшты, таленту заўсёды няпроста. Таму і ў скульптуры хацелася адлюстраваць перажыванні».

### «ВОЗЕРА ДЗЯЦІНСТВА»



«Аднойчы я быў на Браслаўскіх азёрах. Мы прыехалі позна, але вырашылі паплаваць. Вада — чыстая, як люстэрка. І вось ты плывеш, і нібыта ў зорным небе. Зоры люструюцца ў вадзе... Плывеш — і разграбаеш зоры. Гэта было так незвычайна... І ўзнікла ідэя скульптуры, метафары дзяцінства, калі свет адлюстроўваецца ў возеры... Метафара мары, калі дзіця ўяўляе будучае сваё жыццё. Калі гэта жыццё ў мастацтве, важна, каб знайшоўся добры настаўнік. Дзяцей, якія лепяць, нашмат меней, чым дзяцей, якія малююць. Таму, калі дзіця пачынае ляпіць раней, чым малюваць, гэта добрае прадвесце — можа, такое дзіця і не стане скульптарам, але аб'ёмнае прасторавае мысленне ў яго будзе. Можа быць архітэктарам, інжынерам... Сцвердзіцца ў любой прафесіі, дзе трэба арганізоўваць прастору».

### «ВЯЧЭРНІ БЛЮЗ»



«Скульптура была зроблена для сусветнага парку скульптуры ў Пекіне. Постаць саксафаніста адкідвае доўгі цень ад заходзячага сонца, уманціраваны ў тратуар. Вы ж ведаеце, што такое блюз? Гэта споведзь. Джаз — увогуле ў многім споведзь. Вячэрні блюз... Час, калі дзень прайшоў, трэба задумацца, што адбылося, што ты за гэты дзень зрабіў? Часта пытаюцца, хто прататып музыканта. Ён у прынцыпе ёсць, але я люблю рабіць вобразы зборныя. Музыцы прысвечана некалькі маіх работ... Вось тая скульптура, у форме камертона, — «Прадчуванне гука». Постаць хлопчыка, які яшчэ не ведае, што будзе з яго жыццём, як ён загучыць. У мяне ёсць працяг гэтай тэмы — я хачу зрабіць некалькі такіх камертонаў. Акрамя прадчування гуку, увасобіць момант, калі гук узнікае, гучыць».

### «АНТОНІЙ ТЫЗЕНГАЎЗ»



«А гэта мадэль помніка рэфарматару XVIII стагоддзя Антонію Тызенгаўзу ў Паставах, дзе ён заснаваў мануфактуры. Там ёсць цудоўна захаваная рэзідэнцыя гэтага дзеяча. Мне хацелася не проста зрабіць помнік, а прывязаць да часу і прасторы, да існуючай гістарычнай сітуацыі. Найлепшае месца я ўбачыў там, дзе каля палаца раслі вялікія елкі... І мясцовыя ўлады пайшлі насустрач, тыя елкі перасадзілі... І помнік выдатна ўпісаўся ў прастору. Скульптары кажуць, што калі помнік удала ўпісаўся ў прастору, гэта пяцьдзясят працэнтаў поспеху. Таму што ёсць работы, якія нібыта і няблага зробленыя, але яны «не сядзяць» у прасторы, «не жывуць» там. Бывае, калі ты сам можаш прапанаваць месца, і з табой згаджаюцца. Але часцей, асабліва ў горадзе, табе загадзя вылучаюць месца для помніка, і ты павінен знайсці вобраз, які б там жыў. У Мар'інай Горцы хачу паставіць помнік Ігару Лучанку. Гэта фігура глабальная, сусветнага ўзроўню. Там ёсць музычная школа, якой добра было б таксама даць імя Лучанка. Вось перад гэтай школай выдатна стаў бы гэты помнік.

### «ТРЭЦЯЕ ПАКАЛЕННЕ»



«Тры рукі, якія трымаюць адна адну... Гэтая скульптура — філасофская прыпавесць. Філосафы гавораць, што, калі чалавек псіхалагічна раб, свабода да яго прыйдзе толькі ў трэцім пакаленні. Дарэчы, партрэт рукі зрабіць складаней, чым партрэт твару. Рукі таксама непаўторныя, гэта таксама партрэт чалавека, па руках жа нават жыццё чытаюць. Калісьці я прапаноўваў зрабіць у якасці помніка знакамітаму дырыжору Міхаілу Дрынеўскаму яго рукі. На жаль, сваякі не пагадзіліся. А было б цікава...»

### «АПАЛЕНАЕ ДЗЯЦІНСТВА»



«Над кампазіцыяй у Красным Беразе, былым дзіцячым канцлагеры, я працаваў з Уладзімірам Левіным, гэта чалавек быў надзвычай вопытны і аўтарытэтны. Умелы арганізатар, архітэктар-рэжысёр, я б сказаў. Гэта была няпростая тэма... Пачыналі ляпіць адну кампазіцыю... Але праз некалькі гадоў, пакуль вырашаўся лёс праекта, задума змянілася. І ўзнікла вось такая постаць дзяўчынкі. Я ўвогуле ніколі не прыступаю да працы, калі ў мяне не склаўся ясны вобраз, які будзе чытацца, бо скульптура павінна глядзецца з розных бакоў. Зірніце вось на гэтую скульптуру — сімвал сям'і... Трансфармаваная форма яйка. Паліраваная ўнутраная паверхня — гэта той свет сям'і, які аберагаецца, ствараецца ўнутры. А знешняя абалонка, звернутая да сусвету, — шурпатая, якая трывае ўдары».

### «ЛЯСНІК ДЗЯДЗЬКА ЯНКА»



«Да гэтай скульптуры наведвальнікі асабліва часта датыкаюцца... Можа, прываблівае выява вавёркі? У маім родзе былі людзі, звязаныя з лесам. Брат майго дзеда скончыў у Піцеры Інстытут лесу, яшчэ да рэвалюцыі. Ён быў вельмі цікавым чалавекам, распавядаў, як слухаў Шаляпіна, спявачку Гальцаву, паэтаў Срэбнага стагоддзя. У часы рэпрэсій прасядзеў пятнаццаць гадоў у лагерах. Дзед уражваў мяне тым, што ў яго заўсёды ляжалі на стале свежыя літаратурныя часопісы, ён пытаўся, ці я чытаў той ці іншы новы твор: «Ты не разумееш, што ты ўпускаеш!». Цудоўна размаўляў на беларускай мове. У маёй жонкі таксама дзед быў звязаны з лясніцтвам. І ўзнік такі збіральны вобраз. Тэма адзінства нас з прыродай».

### «РУКА ТВОРЦЫ»



«Рука Творцы»... Творца ўсё бачыць, таму і прысутнічае вока на гэтай бронзавай далоні. Гэты вобраз яшчэ наклаўся і на маё ўласнае жыццё. У мяне вялікія праблемы з вачыма. Калі мне зрабілі аперацыю, я гэтую работу падарыў афтальмалагічнаму цэнтру. У скульптуры выкарыстаны розныя матэрыялы: бронза, шкло, камень. Увогуле, матэрыял часта дыктуе форму. Камень для вырабу піраміды — знака на Кастрычніцкай плошчы Мінска, які сімвалізуе нулявы кіламетр, прывезлі з Партугаліі. Калі я гляджу на той знак, заўсёды ўспамінаю словы Несцеркі, які сцвярджаў, што цэнтр Зямлі, «пуп Зямлі», знаходзіцца там, дзе ты стаіш».

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению проектно-изыскательского унитарного предприятия «Институт Полесьепроект» ОАО «Полесьестрой» (продавец) извещает о проведении 31 мая 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **- Капитальное строение с инв. № 330/С-6044**, общей площадью **220,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-бытовой корпус** (составные части и принадлежности: цокольный этаж, покрытие, ограждение, навес). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000001000125** общей площадью **0,1162 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания административно-бытового корпуса | **129 000,00** | 6 450,00 |
| 2 | **- Капитальное строение с инв. № 330/С-6039**, общей площадью **612,9 кв. м,** назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **здание для хранения автомашин** (составные части и принадлежности: площадки и проезды асфальтобетонные, ограждение). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13В/1.<br>**- Капитальное строение с инв. № 330/С-6037**, общей площадью **130,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание бытовых помещений** (составные части и принадлежности: навес, покрытие, труба дымовая). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13В.<br>**Информация о земельном участке:** расположены на земельном участке с кадастровым номером **323550100001001978** общей площадью **0,2189 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13В. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания бытовых помещений, здания хранения машин | **225 200,00** | 11 260,00 |
| 3 | **- Капитальное строение с инв. № 330/С-6045**, общей площадью **277,9 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание складское с лабораторией** (составные части и принадлежности: покрытие, ограждение). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13Б.<br>**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **323550100001001979** общей площадью **0,1312 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13Б. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания складского с лабораторией.<br>**- Капитальное строение с инв. № 330/С-6041**, общей площадью **7,5 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание складское с навесом** (составные части и принадлежности: навес, покрытие, ограждение). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13А.<br>**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **323550100001001980** общей площадью **0,0331 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13А. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания складского с навесом.<br>**- Капитальное строение с инв. № 330/С-6038**, общей площадью **9,3 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание проходной** (составные части и принадлежности: тротуарная дорожка, ограждение). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13Г.<br>**Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **323550100001001981** общей площадью **0,0232 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13Г. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания здания проходной | **107 963,27** | 5 398,16 |

**Продавец:** проектно-изыскательское унитарное предприятие «Институт Полесьепроект» ОАО «Полесьестрой», 247760, г. Мозырь, ул. Ленинская, 12.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел. **8 (029) 734-74-00 Дайнеко Наталья Олеговна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (проектно-изыскательское унитарное предприятие «Институт Полесьепроект» ОАО «Полесьестрой»):** р/с BY39BLBB30120400087444001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 491199000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № __ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление Организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 апреля 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 29 мая 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до его проведения.

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством). В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в течение **5 (пяти) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»),** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56; 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703. УНП 191224638** |
| **Продавец** | **ЗАО «Белтехнология и М», г. Минск, пр. Пушкина, д. 70, УНП 100770618. Тел. +375 29 6139869** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**

**Ограждение бетонное** (инв. номер 980773).
Месторасположение: г. Минск, ул. Притыцкого, 62/12

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 1625,02 дол. США**
Шаг аукциона – 81,25 дол. США

**Адрес: г. Минск, пр-т Пушкина, 70**

**Лот № 2**

**Административное, производственное** (2007,2 кв. м, 500/С-21619). В состав лота входит оборудование: перечень см. на сайте организатора аукциона (ipmtorgi.by).
***Сведения о земельном участке:*** пл. **0,3600 га,** предоставлен продавцу на праве постоян. пользования. Ограничения (обременения) прав: охранные зоны технич. водопровода (пл. 0,0883 га), газофикации сред. давления (пл. 0,0414 га)

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 671 494,83 дол. США**
Шаг аукциона – 33574,74 дол. США

**Лот № 3**

Состав лота: **домик-сторожка** (инв. № 2), **ограждение из металлич. сетки** (инв. № 4), **ворота самонесущие с электромехан. приводом и калиткой** (инв. № 5), **теплотрасса** (инв. № 30121)

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 2 081,34 дол. США**
Шаг аукциона – 104,07 дол. США

**Лоты № № 4–14 – оборудование, бывшее в употреблении**

| Лот № | Наименование | Нач. цена (с НДС), дол. США | Шаг аукциона*, дол. США |
|---|---|---|---|
| 4 | **Аппарат гидроабразив. резки (инв. № 70103)** | **16 971,78** | 848,59 |
| 5 | **Полуав-т для пайки дорож. резцов модели АПЗ-124 (инв. № 70124)** | **13 342,80** | 667,14 |
| 6 | **Полуавтомат для пайки дорож. резцов модели АПЗ-4 (инв. № 41028)** | **9 648,92** | 482,45 |
| 7 | **Техн. линия по производ. путев. шуруп. на базе стана попереч.-клин. с инд. нагрев. SPL2500-2-IH-133 (инв. № 70179)** | **200 579,12** | 10 028,96 |
| 8 | **Робот промышленный KUKA KR 150 со шкафом управления и соединит. кабелями** | **16 142,97** | 807,15 |
| 9 | **Профильный проектор Helios 350H** | **5 734,20** | 286,71 |
| 10 | **Незавершенное пр-во стана поперечно-клиновой прокатки SP-5000-2** | **794 670,34** | 39 733,52 |
| 11 | **Снегоотбрасыватель ST268EP** | **1 220,79** | 61,04 |
| 12 | **Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25MoCr4: d 101,6 мм х 8809 мм – 2436 кг** | **3 580,64** | 179,03 |
| 13 | **Горячекат. легиров. круглый прокат марки 25MoCr4: d 110,0 мм х 8790 мм – 2 318,49 кг** | **3 424,20** | 171,21 |
| 14 | **Стальные катанные прутки марки 25 MoCr4, 102,00 мм – 1 900,00 кг** | **1 851,98** | 92,60 |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка Предмета аукциона** проводится за счет покупателя

*Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни по предварительному согласованию +375 (29) 6139869 Дмитрий

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидир. юридич. лица с публич. торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидир. юридич. лица».
С подробной информацией о перечне представляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте **ipmtorgi.by**

**Задаток по лотам №№ 2, 7, 10 – 1 %, по остальным – 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 191224638, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи – 7 (семь) дней** после проведения аукциона

**Срок оплаты предмета аукциона:** не позднее **7 (семи) календарных дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размерах, указанных в информации об аукционе на сайте www.ipmtorgi.by, от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.02.2023

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время начала аукциона: 30.05.2023 в 13.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б**. Заявки** на участие **принимаются по 26.05.2023 до 17.00** по тому же адресу

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37, +375 44-704-92-06.**
**E-mail: auction@ipmconsult.by**

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

***Место проведения***: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 66-114. ***Форма проведения:*** открытый конкурс. ***Предмет торгов:*** право на заключение договора купли-продажи объекта торгов (далее – ДКП).

***Наименование объекта торгов:***

КВАРТИРА с инв. № 500/D-110879,
г. Минск, ул. Короля, 47-21.

***Сведения об объекте:*** общ. площадь: 59,2 кв. м. ***Дата и время проведения торгов:*** 10.05.2023 в 10.00. **Начальная цена** (сумма в белорусских рублях эквивалентная): 88 000 долл. США по курсу НБ РБ на день проведения торгов. ***Задаток:*** 4380,00 бел. руб. ***Организационный сбор:*** 4380,00 бел. руб. ***Срок заключения договора купли-продажи:*** 30 рабочих дней с момента утверждения протокола. ***Расчеты за объект:*** в день заключения ДКП. ***Передача объекта:*** в день заключения договора купли-продажи. ***Срок снятия с рег. учета*:** до заключения договора купли-продажи. ***Окончание приема заявок***: 5.05.2023 в 17.00. Расходы по государственной регистрации ДКП и основанных на нем прав оплачиваются: Заказчиком и Победителем (единственным участником) в равных долях. ***Иные условия проведения объявленных торгов*:** срок возможного отказа от проведения торгов до момента окончания приема заявок. Право подачи и подписания заявления о государственной регистрации ДКП и основанных на нем прав предоставляется покупателю. Лицо, выигравшее торги, определяется в соответствии с Порядком организации и проведения торгов, утвержденным приказом директора ООО «ЦентрСитиБай» от 06.04.2018 г. № 2. К участию в торгах допускаются лица, внесшие задаток и подавшие заявку на участие в торгах, а также представившие организатору заверенную банком копию платежного поручения или соответствующую квитанцию о перечислении задатка. Организационный сбор уплачивается Победителем (единственным участником торгов) в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола. Сумма задатка учитывается при окончательном расчете между Победителем (единственным участником торгов) и Организатором. Задаток перечисляется на р/с: BY35MTBK30120001093300089651, ЗАО МТБанк, Код MTBKBY22, г. Минск, ул. Толстого, д. 10, УНП 193056974. **Организатор: Общество с ограниченной ответственностью «ЦентрСитиБай»,** УНП 193056974, **тел. +375 (17) 231-73-93, e-mail: info@centrcity.by, www.centrcity.by**

---

## Информация ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2022 год

| № п/п | Наименование показателей | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тыс. руб. | 244 459 | 218 274 |
| 2. | Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию | тыс. руб. | 238 239 | 212 524 |
| 3. | Прибыль (убыток) до налогообложения, всего (Прибыль (убыток) отчетного периода) | тыс. руб. | 3 472 | 3 338 |
| 3.1. | в том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг | тыс. руб. | 6 220 | 5 750 |
| 3.2. | прочие доходы и расходы по текущей деятельности | тыс. руб. | -2 582 | -2 922 |
| 3.3. | прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | тыс. руб. | -166 | 510 |
| 4. | Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода) | тыс. руб. | 856 | 910 |
| 5. | Чистая прибыль | тыс. руб. | 2 616 | 2 428 |
| 6. | Долгосрочная дебиторская задолженность | тыс. руб. | 99 | 260 |
| 7. | Долгосрочные обязательства | тыс. руб. | 686 | 361 |
| 8. | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде, всего | тыс. руб. | 832,2 | 722,8 |
| 9. | Дивиденды на одну акцию, начисленные в данном отчетном периоде | руб. | 0,948902696 | 0,824161 |
| 10. | Количество простых (обыкновенных) акций, находящихся на балансе Общества | штук | 0 | 0 |
| 11. | Количество акционеров, всего | лиц | 2 359 | 2 353 |
| | в том числе: | | | |
| 11.1. | юридических лиц | лиц | 1 | 1 |
| 11.2. | физических лиц | лиц | 2 358 | 2 352 |
| 12. | Среднесписочная численность работающих | лиц | 1 650 | 1 669 |
| 13. | Обеспеченность акции имуществом Общества | руб. | 36,15 | 32,70 |

Доля государства в уставном фонде эмитента составляет 51,30 %.

Основной вид деятельности, по которому получено двадцать и более процентов выручки от реализации продукции, работ, услуг – строительство.

Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за 2022 год – 31 марта 2023 г.

Проверка достоверности годовой бухгалтерской и финансовой отчетности ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» за 2022 год проведена ООО «МаиС Консалт Белстрой».

Размер дивидендов на одну акцию составляет 0,948902696 рубля.

Выплата дивидендов на акции, принадлежащие физическим лицам, будет перечислена на лицевые счета ОАО «Сбер Банк», а также производиться посредством почтовых переводов РУП «Белпочта» и выдачу в кассах филиалов Общества в срок до 30.05.2023.

Выплата дивидендов на акции, находящиеся в собственности г. Минска, будет перечислена не позднее 22.04.2023.

Адрес официального сайта ОАО «СТРОЙТРЕСТ № 4» в глобальной компьютерной сети — http://stroytrest4.by.

Справки по тел. +375173343364.

УНП 100055368

# «ВАРОТЫ АФРЫКІ» Ў АГНІ

## Што адбываецца ў Судане?



**Ваеннае сутыкненне рэгулярнай арміі і сіл аператыўнай падтрымкі (Rapid Support Forces, RSF) у Судане, які называюць «варотамі ў Афрыку», прыцягнула ўвагу без перабольшвання ўсяго свету. Апошнія падзеі ў адной з ключавых дзяржаў Чорнага кантынента ў топе навін інфармацыйных агенцтваў. Жорсткія баявыя дзеянні ў Судане працягваюцца ўжо два тыдні. Яны ахапілі як мінімум 6 з 18 штатаў краіны. Як паведаміла ТАСС са спасылкай на Міністэрства аховы здароўя Судана, загінулі больш чым паўтысячы чалавек, звыш чатырох тысяч атрымалі раненні. На фоне баявых дзеянняў паўстаў востры дэфіцыт харчавання, вады, паліва і лекаў, цэны на гэтыя жыццёва неабходныя тавары ўзляцелі шматразова, паведаміла Упраўленне ААН па каардынацыі гуманітарных пытанняў. У ЗША заявілі, што ў Хартуме функцыянуе толькі 16 працэнтаў медыцынскіх устаноў. Што ж адбываецца ў Судане?**

### Крытычная маса

Палітычны крызіс у Судане пачаўся пасля таго, як у красавіку 2019-га ў выніку ваеннага перавароту быў адхілены ад улады прэзідэнт Амар аль-Башыр. Улада перайшла да пераходнага ўрада, чыёй галоўнай задачай, як было абвешчана, з'яўлялася арганізацыя дэмакратычных выбараў і перадача паўнамоцтваў абранаму прэзідэнту. Але ў 2021-м суданская армія аб'явіла надзвычайнае становішча і ўзяла ўладу ў свае рукі, паабяцаўшы вывесці краіну з зацяжнога эканамічнага і палітычнага крызісу, а затым перадаць уладу законна абраным прадстаўнікам народа.

Аднак калі гэта адбудзецца — незразумела. У пачатку снежня мінулага года суданскія генералы Абдэль-Фатах аль-Бурхан і Мухамед Хамдан Дагала — менавіта тыя, хто цяпер ваююць адзін з адным, — падпісалі з грамадзянскай кааліцыяй «Сілы за свабоду і перамены» пагадненне аб фарміраванні грамадзянскага пераходнага ўрада. Згодна з дакументам, пасля з'яўлення такога ўрада вайскоўцы павінны адысці ад дзяржаўнага кіравання. Але, мяркуючы па цяперашніх баях, зараз генералы дзеляць уладу, так што праект грамадзянскага ўрада адкладаецца на нявызначаны тэрмін. «Цяперашнія падзеі сталі вынікам дасягнення крытычнай масы супярэчнасцяў менавіта паміж дзвюма ваеннымі групамі, якія так і не змаглі прыцішыць свае палітычныя амбіцыі, накіраваныя на дасягненне ўсёй паўнаты ўлады ў краіне», — заўважыў news.ru прафесар Пяцігорскага дзяржуніверсітэта Дзяніс Міргарад.

### Джыны на конях

Сілы аператыўнай падтрымкі з'явіліся ў Судане больш чым 20 гадоў таму ў багатым золатам і нафтай рэгіёне Дарфур на захадзе афрыканскай краіны, які насяляюць арабы і чарнаскурыя плямёны фур. Пры гэтым карэннае насельніцтва лічыць, што арабы прымаюць чарнаскурых за людзей другога сорту і прыгнятаюць іх, прысвойваючы рэсурсы чорных плямёнаў. «Калі ў 2003 годзе фур паўсталі супраць цэнтральнага ўрада, улады арганізавалі карнае падраздзяленне з арабскага насельніцтва Судана, якое атрымала назву «Джанджавід» (у перакладзе — «джыны на конях»). Па сутнасці, гэта племянная міліцыя. З часам «джанджавіды» станавіліся ўсё мацнейшымі і працягвалі выконваць дзяржаўныя задачы па падтрыманні бяспекі ў розных рэгіёнах», — распавёў news.ru Ігар Герасімаў.

Яны вырашалі племянныя канфлікты — гэта для Судана гістарычна балючае пытанне. Там 19 этнічных груп і амаль 600 малых народнасцяў. Такім шляхам «Джанджавід» стаў уплывовым праўрадавым ваенізаваным фарміраваннем. У 2013 годзе прэзідэнт Судана Амар аль-Башыр рэарганізаваў «джынаў» у RSF і прысвоіў яго ўдзельнікам вайсковыя званні. Цяпер Сілы аператыўнай падтрымкі, якія ўзначальвае генерал Мухамед Хамдан Дагала, налічваюць, па розных ацэнках, ад 50 да 140 тысяч чалавек. Па меркаванні экспертаў, RSF досыць моцныя і вопытныя, каб паспяхова супрацьстаяць рэгулярнаму войску.

Апошнюю чвэрць стагоддзя Судан прадаваў вайсковую сілу тым, хто быў гатовы заплаціць. «Ён прадаваў наймітаў у Чад падчас грамадзянскай вайны ў гэтай краіне ў 2005—2010 гады. Ён прадаваў вайсковую сілу ў Лівію падчас грамадзянскай вайны з 2014 года. Ён прадаваў ваенную сілу ў Емен для патрэб ваеннай кааліцыі на чале з Саудаўскай Аравіяй. Цяпер патрэбы ў гэтых вайскоўцаў няма, яны ўсё вярнуліся дадому. Але ў Судане зарабіць няма дзе. У выніку пад іх кантроль трапілі розныя сферы нелегальнага бізнесу. Кантрабанда. Акрамя таго, яны кантралююць нелегальную здабычу золата на тэрыторыі Судана, — распавёў mir24.tv навуковы супрацоўнік Цэнтра арабскіх і ісламскіх даследаванняў Інстытута ўсходазнаўства РАН Рыгор Лук'янаў. — Для таго каб яго вывезці за мяжу і прадаць, дастаткова самалёта і аэрадрома, з дапамогай якога яго можна вывезці».

### Войска супраць спецназа

Фармальнай падставай для маштабнага вайсковага канфлікту стала жаданне Абдэль-Фатах аль-Бурхана скончыць з незалежнасцю Сіл аператыўнай падтрымкі і падпарадкаваць іх агульнаармейскаму кіраўніцтву, гэта значыць сабе. Каб не пакрыўдзіць свайго намесніка, кіраўнік савета прапанаваў увесці двухгадовы пераходны перыяд, за гэты час спецназ павінен быў уліцца ў шэрагі войска і фактычна пакінуць Мухамеда Хамдана Дагала без рычагоў улады, якімі па суданскай традыцыі могуць быць толькі ўзброеныя прыхільнікі. Таксама ў RSF лічаць, што ім павінны перадаць прыбытковыя актывы з сельскай гаспадаркі, гандлю і прамысловасці за баявыя заслугі і выкананне важных работ замест рэгулярнага войска. Мухамед Хамдан Дагала спрабаваў пазбегнуць узброенага супрацьстаяння, прапанаваўшы сустрэчны план: у адпаведнасці з ім Сілы аператыўнай падтрымкі пяройдуць у падпарадкаванне да



войска на працягу дзесяці гадоў. Для дэманстрацыі сур'ёзнасці сваіх намераў ён прывёў RSF у баявую гатоўнасць і ўзяў пад кантроль частку інфраструктуры, перш за ўсё аэрапорт, размешчаны на поўначы краіны. Аднак Абдэль-Фатах аль-Бурхан чамусьці вырашыў, што сіла на яго баку, і не пайшоў на кампраміс. У выніку войска Судана паспрабавала абрынуць усю сваю механізаваную моц на лёгкаўзброеныя сілы спецназа.

Калі б справа адбывалася ў чыстым полі, то Узброеныя сілы лёгка разграмілі б RSF, але баі ідуць у гарадах, дзе спецназаўцы хутка перамяшчаюцца, хаваючыся ад авіяўдараў і спальваючы танкі саперніка, адзначае expert.ru. У выніку спецназ хутка захапіў прэзідэнцкі палац, штаб арміі, будынак тэлебачання і мноства іншых адміністрацыйных будынкаў, устанавіўшы наземны кантроль над большай часткай сталіцы краіны Хартумам. Пры гэтым войска мае амаль поўны кантроль у паветры, наносячы ўдары па захопленых будынках. Пасля некалькіх дзён баёў склалася тупіковая сітуацыя: войска не мае сіл адбіць сталіцу і іншыя гарады, а Сілы аператыўнай падтрымкі, якія фармальна захапілі ўладу, не могуць выйсці за межы гарадоў, якія імі ўтрымліваюцца.

Цяперашні канфлікт нельга разглядаць толькі як барацьбу за ўладу і эканамічныя патокі, якія кантралюе кожны з бакоў. Судан, як і большасць афрыканскіх краін, быў цалкам адвольна ўтвораны еўрапейскімі каланізатарамі, якія правадзілі межы без уліку спецыфікі плямёнаў, што пражываюць на іх тэрыторыі. Генерал Абдэль-Фатах аль-Бурхан — выхадзец з поўначы краіны, а Мухамед Хамдан Дагала — з поўдня, што робіць магчымы пройгрыш аднаго з іх не асабістым паражэннем, а ўшчамленнем інтарэсаў кожнага з рэгіёнаў.

«Ёсць, вядома, супрацьстаянне розных гульцоў у барацьбе за суданскія рэсурсы, і ў тым ліку вельмі зручна выкарыстоўваць знешнім гульцам такую маніпуляцыю, як стварэнне гарантаванай зоны нестабільнасці. Таму што Судан — гэта найвялікшы чорны рынак зброі», — распавяла афрыканіст, кандыдат палітычных навук, дацэнт факультэта сусветнай палітыкі МДУ Наталля Піскунова. Канфлікт абвастраецца і тым, што лідараў падтрымліваюць розныя краіны. Так, аль-Бурхану і войску дапамагаюць Егіпет і ўплывовыя ісламскія дзеячы краіны. У той час, як за Дагала і RSF стаяць Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Саудаўская Аравія, ЗША і Еўрапейскі саюз.

### Вырвацца з Хартума

Сотні тысяч жыхароў Судана бягуць у суседнія краіны ад гвалту. Ва Упраўленні Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў заявілі, што займаюцца пытаннямі, звязанымі з бежанцамі. Па іх ацэнках, з-за боесутыкненняў каля 270 тысяч чалавек перасякуць межы толькі з Чадам і Паўднёвым Суданам. Пры гэтым многія накіруюцца ў іншыя краіны рэгіёна — у Егіпет, Эрытрэю, Эфіопію, ЦАР і ў Лівію, але агенцтва ААН пакуль не гатова даць ацэнку, аб якой колькасці бежанцаў можа ісці размова.

Асцярога наконт бяспекі ўзмацнілася пасля таго, як Сусветная арганізацыя аховы здароўя аб'явіла аб «велізарнай біялагічнай рызыцы» пасля захопу баевікамі лабараторыі ў Хартуме, дзе захоўваюцца ўзоры ўзбуджальнікаў халеры, адзёру, поліяміеліту і іншых інфекцыйных захворванняў. У выніку баявых дзеянняў загінулі сотні людзей. Некаторыя раёны Вялікага Хартума ляжаць у руінах. Многія краіны прыступілі да эвакуацыі сваіх грамадзян з Судана. Вядома, небяспека вялікая. Асабліва рызыкоўна выязджаць з Хартума і яго наваколля. Сталічны аэрапорт стаў месцам баявых дзеянняў. Бежанцы перасякаюць мяжу з Егіптам, Чадам, Паўднёвым Суданам.

Але арганізаваная эвакуацыя замежнікаў у асноўным ідзе праз Порт-Судан на Чырвоным моры. Менавіта туды накіроўваюцца замежныя караблі і самалёты. Аднак да Порт-Судана са сталіцы яшчэ трэба дабрацца — гэта прыкладна 850 кіламетраў ад Хартума. Да граніцы з Егіптам яшчэ болей. Але галоўнае — вырвацца з ахопленай баямі сталіцы. Да месцаў збору эвакуацыйных канвояў многія дабіраюцца на свой страх і рызыку. Аднак нават арганізаваны канвой не дае поўную гарантыю бяспекі.

### Кнот для рэгіёна

Выступаючы на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН, генеральны сакратар арганізацыі Антоніу Гутэрыш заклікаў да неадкладнага спынення кровапралітнага канфлікту ў Судане. У выніку гвалту дзясяткі тысяч людзей былі вымушаны пакінуць свае дамы, а па ўсёй краіне адбываюцца ўзброеныя сутыкненні. Медыцынскія службы перажываюць калапс, некаторыя бальніцы выкарыстоўваюцца ўзброенымі групоўкамі, а запасы прадуктаў харчавання, вады, медыкаментаў і паліва скарачаюцца.

Генеральны сакратар ААН падкрэсліў, што ваенны канфлікт, які зацягнуўся, можа мець разбуральныя наступствы, паколькі Судан мяжуе з сямю краінамі, а ўсе яны апошнім часам пакутуюць ад хваляванняў і канфліктаў. «Барацьба за ўладу ў Судане ставіць пад пагрозу будучыню не толькі гэтай краіны. Дадзены канфлікт — палаючы кнот, які можа здэтанаваць у некалькіх краінах, прычыніць вялізныя пакуты і адкінуць развіццё на дзесяцігоддзі назад», — адзначыў генеральны сакратар.

Тым часам стала вядома, што фактычны кіраўнік краіны генерал Абдэль-Фатах аль-Бурхан папярэдне ўхваліў план па падаўжэнні перамір'я, прапанаваны афрыканскім рэгіянальным аб'яднаннем IGAD (гандлёвы блок з васьмі краін Афрыкі, куды ўваходзіць і Судан), перадае Reuters. План таксама прадугледжвае адпраўку прадстаўнікоў рэгулярнага войска і ваенізаванага фармавання RSF на перагаворы ў сталіцу Паўднёвага Судана Джубу. Магчыма, усё ж удасца нарэшце патушыць палаючыя «вароты Афрыкі». Прынамсі, на гэта з'явілася хоць нейкая надзея.

**Захар БУРАК.**

**Тым часам**

### З СУДАНА Ў ЕГІПЕТ ПРАЗ СУХАПУТНУЮ ГРАНІЦУ ВЫЕХАЛІ ШЭСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ГРАМАДЗЯН

Яны працавалі на суданскія кампаніі па прыватных кантрактах. Аб гэтым паведаміў прэс-сакратар МЗС Беларусі Анатоль Глаз, перадае БелТА.

«Прытым гэта ініцыятыва была спалучана з вялікай рызыкай, — адзначыў прэс-сакратар МЗС. — Граніцу ўдалося перасекчы пры актыўным садзейнічанні нашых дыпламатаў і расійскіх калег. Насустрач нам пайшлі і егіпецкія ўлады. Цяпер яны знаходзяцца ў Егіпце для вяртання на радзіму».

Паводле апошняй інфармацыі, на тэрыторыі Судана ў горадзе Хартуме знаходзяцца дзесяць грамадзян Беларусі, трое з якіх размешчаны ў пасольскім комплексе Расіі. Месцы знаходжання ўсіх беларусаў вядомыя і з'яўляюцца найбольш бяспечнымі ў існуючых умовах. Консульская служба Пасольства Беларусі ў Егіпце падтрымлівае з усімі пастаянную сувязь. «Прапрацоўваюцца спосабы і шляхі іх эвакуацыі», — удакладніў Анатоль Глаз.

«У Беларусі з крайняй трывогай і занепакоенасцю назіраюць за развіццём сітуацыі ў Судане. Заклікаем бакі супрацьстаяння праяўляць стрыманасць, забяспечыць абарону грамадзянскіх асоб, дыпламатычных місій у Хартуме, стварыць магчымасць для эвакуацыі замежных грамадзян, якія знаходзяцца ў Судане, — заявіў прэс-сакратар МЗС. — Зыходзім з таго, што мірнае ўрэгуляванне цяперашняга крызісу на падставе нацыянальнага кансэнсусу з'яўляецца адзіным магчымым варыянтам вырашэння сітуацыі».

Праблемы і рашэнні

# ТРАНСПАРТНЫ КОМПЛЕКС РАЗВІВАЕЦЦА

## Насуперак сучасным выклікам

**Сітуацыю ў транспартнай галіне абмеркавалі падчас сустрэчы міністр транспарту Аляксей Аўраменка з актывам Беларускага прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый на чале з яго старшынёй Мікалаем Мацюком.**



Удзельнікі мерапрыемства адзначылі, што транспартны комплекс Беларусі, нягледзячы на сучасныя выклікі, устойліва забяспечвае сацыяльныя, вытворчыя і знешнеэканамічныя мэты. Пры гэтым транспарт традыцыйна ўносіць значны ўклад у экспарт паслуг, а транспартныя камунікацыі ў поўнай меры задавальняюць попыт на перамяшчэнне ўнутрырэспубліканскіх і транзітных грузавых і пасажырскіх патокаў. У Беларусі распрацавана і рэалізоўваецца Стратэгія інавацыйнага развіцця транспартнага комплексу да 2030 года, якая прадугледжвае меры, што забяспечваюць удасканаленне работы транспарту і яго інфраструктуры.

Дарэчы, мерапрыемства прайшло ў фармаце дыялогу: пытанне — адказ. Прысутныя засяродзвалі ўвагу на зарплаце работнікаў галіны, прыцягненні і замацаванні кадраў, паляпшэнні якасці дарог, абнаўленні аўтапарка, падтрыманні бяспекі пасажыраў і кіроўцаў.

Як адзначыў Аляксей Аўраменка, ён гатовы выслухаць кожнага, хто хоча выказаць меркаванне накont работы транспарту Беларусі, паколькі менавіта на месцах, у калектывах відаць тыя праблемы, якія неабходна вырашаць у першую чаргу. Пацікавіўся міністр і сітуацыяй у працоўных калектывах. Прысутныя падкрэслілі, што абстаноўка стабільная. Аляксей Аўраменка адзначыў, што заробкі варта павышаць за кошт павелічэння эфектыўнасці працы, аб'ёму работ, дадатковых гарантый па калектыўным дагаворы.

Шэраг пытанняў датычыў якасці, рамонту і будаўніцтва дарог. Напрыклад, гэта турбуе прадстаўніка галіновага прафсаюза Віцебскай вобласці. Аляксей Аўраменка зазначыў, што сёння прымаюцца ўсе неабходныя меры па рэканструкцыі цвёрдага дарожнага пакрыцця. У Беларусі запланавана адрамантаваць каля тысячы кіламетраў аўтатрас рэспубліканскага прызначэння і каля тысячы кіламетраў мясцовых дарог. Працягваецца рэканструкцыя аўтамабільнай дарогі Р53 Слабада — Навасады на ўчастку ад Смалявіч да Жодзіна (больш за 14 км). Увод запланаваны на 2024 год.

Таксама ў гэтым годзе пачнецца рэканструкцыя адрэзка аўтамабільнай дарогі М3 Мінск — Віцебск ад Лагойска да Плешчаніц працягласцю 15 км.

Падчас сустрэчы была таксама агучана тэма абнаўлення аўтапарка. Напрыклад, прадстаўнік Брэсцкай вобласці распавёў, што гарадскія і прыгарадныя аўтобусы зношаныя на 70 працэнтаў.

Міністр падкрэсліў, што ў Беларусі дзейнічае Дзяржаўная праграма «Транспартны комплекс» на 2021—2025 гады. У яе межах набываецца пасажырскі транспарт. У мінулым годзе закуплена 50 тралейбусаў і 195 аўтобусаў. А за першы квартал сёлета набылі 20 тралейбусаў і 44 аўтобусы. У распрацоўцы — механізмы і крыніцы набыцця новай тэхнікі.

Напрыканцы сустрэчы міністр падзякаваў усім прысутным за змястоўную і прадметную размову. І нагадаў, што найпершая задача на месцах, у калектывах — ствараць добрыя ўмовы працы для работнікаў і шукаць крыніцы павышэння заработнай платы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


1 МАЯ

Паважаныя ўдзельнікі прафсаюза работнікаў транспарту і камунікацый!

Дарагія сябры і калегі!

Ад усёй душы віншую вас з 1 Мая, святам вясны і працы! Гэтае свята напаўняе нашы сэрцы асаблівым пачуццём — яднання ўсіх тых, хто сваёй працай стварае стабільнасць і дабрабыт роднай Беларусі, уласнымі рукамі стварае будучыню нашай краіны. Усіх нас аб'ядноўвае агульнае імкненне добрасумленна працаваць на карысць нашых сем'яў і ў цэлым нашага грамадства.

Працоўныя дасягненні ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі становяцца надзейным падмуркам дабрабыту і працвітання, дазваляюць з упэўненасцю глядзець у заўтрашні дзень. І работнікі сферы транспарту і камунікацый уносяць дастойны ўклад у стабільнае сёння і светлае заўтра нашай краіны.

Няхай вясна прынясе ў вашы сем'і згоду, падорыць новыя мэты і надзеі. Няхай Першамай адкрые новыя магчымасці для прафесійнага росту і новыя гарызонты прафесіяналізму! Здароўя, даўгалецця, цяпла і міру вам, дарагія калегі!

**Старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў транспарту і камунікацый Мікалай МАЦЮК.**

УНП 805003367


З архіўных крыніц

# Жыццё павінна быць асветлена...

## Аб чым пісьменнік Якаўлеў пісаў Пятру Машэраву

**Сярод іншай пошты да Першага сакратара ЦК КП Беларусі Пятра Міронавіча Машэрава, якая захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, некаторую цікавасць выклікае і вось гэты зварот ад 5 кастрычніка 1973 года... Піша ў беларускі партыйны (і, лічы, дзяржаўны) орган улады рускі празаік, кінасцэнарыст, драматург, аўтар кніг для падлеткаў і юнацтва Юрый Якаўлеў (1922—1995).**

З самага пачатку творчага шляху пісьменніка хвалявала ваенная тэма. Спрыяў гэтаму і ўласны франтавы вопыт. Юрый Хоўкін (сапраўднае прозвішча літаратара) у 1940 годзе прызвалі ў Чырвоную Армію. На пасадзе хімінструктара зенітна-артылерыйскага палка малады чалавек удзельнічаў у абароне Масквы. Быў паранены. Яго маці памерла ў блакадным Ленінградзе. У 1952 годзе Юрый закончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Пачаў актыўна займацца журналістыкай. Шмат ездзіў па краіне. Удзельнічаў як карэспандэнт у вайсковых вучэннях у Прыкарпацці. Ішоў на тарпедным катары па шляху дэсанта Цэзара Кунікава. Бываў на пагранічных заставах Беларусі. Неаднойчы прыязджаў на руіны Брэсцкай крэпасці. З першых кніг — «Растуць сыны», якая пабачыла свет у 1955 годзе. А самая першая — «Наш адрас» — выйшла яшчэ ў час вучобы ў Літінстытуце, у 1949 годзе. Прафесіі пісьменніка маладога творцу вучыў сам Леў Касіль. Мо гэта ў значнай ступені і паўплывала на тое, што Юрый Якаўлеў стаў дзіцячым пісьменнікам. Ён з'яўляецца аўтарам кніг «А Вараб'ёў шкло не выбіваў», «Станцыя «Хлопчыкі», «Пра нашых дзяцей», «Сябар капітана Гастэла», «Калі ад'язджае сябар», «Родная краіна»... Юрый Якаўлеў — аўтар сцэнарыя мастацкага фільма Вячаслава Нікіфарава «Зімародак», у якім здымаліся такія славутыя акцёры, як Глеб Стрыжэнаў, Марыя Захарэвіч, Аўгусцін Мілаванаў, Уладзімір Самойлаў, Уліс Ліелдзіджс, Віталь Базін... Фільм быў зняты на «Беларусьфільме». Здаецца, не так часта яго цяпер паказваюць. А, між тым, вельмі шчымлівы, прыцягальны... Дарэчы, і мультыплікацыйны фільм пра белае медзведзяня — таксама па сцэнарыі Юрыя Якаўлева. «Спят твои соседи — белые медведи, спи скорей и ты, малыш...» — гэта яго, Юрыя Якаўлевіча Якаўлева, словы з «Калыханкі мядзведзіцы».

Сваіх герояў Юрый Якаўлеў, як правіла, шукаў у гушчы жыцця. Асноўвай аповесці «Дзяўчына з Брэста» і мастацкага фільма «Калыханка для мужчын» стаў лёс Клаўдзіі Шалікавай... Аповесць і сцэнарый да фільма «Дачка камандзіра» Юрыю Якаўлеву дапамаглі напісаць юныя абаронцы Брэсцкай крэпасці...

І што ж прымусіла маскоўскага пісьменніка звярнуцца ажно да Першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі, кандыдата ў члены Палітбюро ЦК КПСС?.. Чытаем у лісце Юрыя Якаўлева:

*«Паважаны Пётр Міронавіч!*

*Добра ведаючы Ваш цяжкі і высакародны ваенны шлях, я звяртаюся да Вас з просьбай прыняць удзел у лёсе юнай гераіні Вялікай Айчыннай вайны Клаўдзіі Ільінічны Шалікавай, пра якую я расказаў на старонках «Известий» у нарысе «Дзяўчынка з Брэста».*

*У першы дзень вайны яна, трынаццацігадовая дзяўчынка, ужо вывела з-пад Брэста параненага байца і выратавала яго зброю. Усю вайну Клава на фронце, на пярэднім краі. Чатыры разы была паранена. Некалькі разоў здзяйсняла выключныя подзвігі. Калі запатрабаваўся конь, яна знайшла яго ў цэнтры вёскі, занятай немцамі. Знішчыла агнявы пункт, які перагароджваў шлях палку пры вызваленні Ціраспаля. Выратавала ад палону цяжка параненага камандзіра капітана Саквараліdзэ. 20 сакавіка ў баі на нямецкай зямлі пад шквальным мінамётным агнём сваім целам закрыла параненага салдата. І была паранена ў твар. Страціла зрок.*

*І ўсё наступнае жыццё Клавы з'яўляецца подзвігам.*

*Некалькі гадоў яна правяла ў шпіталях, дзе ўрачы здзіўляліся яе мужнасці. Пазбаўленая зроку, Клаўдзія закончыла адзінаццацігодку. Самастойна выгадавала сына. Сама вывучыла яго на радыста (яна ж на фронце была радысткай). Яна выдатны патрыёт і агітатар.*

*Зараз Клаўдзіі Ільінічне Шалікавай 45 гадоў. Усё яе суцэльнае жыццё непадзельнае, гераічнае. Цяжкае жыццё. Я глыбока перакананы, што гэта жыццё павінна быць асветлена вышэйшым прызнаннем Радзімы.*

*Карыстаюся нагодай, каб расказаць Вам, Пётр Міронавіч, што мой творчы лёс цесна звязаны з Беларуссю. Нямала нарысаў і апавяданняў, надрукаваных у «Правде» і «Известиях», прысвечаны любімым мною беларусам. На студыі «Беларусьфільм» зняты тры фільмы па маіх сцэнарыях — «Пушчык едзе ў Прагу», «Мы з Вулканам» і «Зімародак». Зараз я напісаў сцэнарый пра маленькага беларускага партызана Барыску для сумеснага беларуска-чэхаславацкага фільма.*

*Жадаю Вам здароўя і натхнення...»*

Ніжэй пададзены адрас Клаўдзіі Ільінічны Шалікавай, якая на той час пражывала ва Украіне, у Львове. Так, не ў Беларусі. Машэраў усё адно накладвае рэзалюцыю: «Аксёнаву А. М., Кузьміну А. Т. Прашу падумаць і ўнесці прапановы». Машэраў, відавочна, зразумеў, чаму масквіч звяртаецца ў Мінск... І сам жа звязаны з Беларуссю, і «дзяўчынка з Брэста» — усё ж з Беларусі. А Брэст, Брэсцкая крэпасць, крэпасць-герой — святая прастора. Беларусь для ўсіх, хто выйшаў з Брэста, крэпасці ў 1941 годзе, хто першым пабачыў вайну, здолеў зрабіць хто што змог, каб толькі выявіць сваё стаўленне да фашысцкіх супастатаў, — гэта як радзіма... А Радзіма да сваіх ставіцца зусёды з разуменнем, ставіцца чула, з душою... Якаўлеў нават і не прасіў нечага канкрэтнага: кватэру, машыну для інваліда Вялікай Айчыннай ці штосьці іншае. Пэўна, пісьменнік падумаў пра тое, што гераічную дзяўчыну, а цяпер жанчыну з пакручастым лёсам павінны неяк адзначыць, проста заўважыць, узяць «на ўлік» у гераічнай і ўважлівай да ваеннай памяці Беларусі...

Сакратар ЦК па ідэалогіі Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін разважыў болей канкрэтна і, што называецца, «па справе». Так нарадзілася кароткая, напісаная ад рукі, тлумачальная запіска: *«т. Шалікава К. І. у гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзілася ў дзеючай арміі. У сапраўдны момант пражывае ў г. Львове. Улічваючы гэта, усе пытанні, якія просіць разгледзець т. Якаўлеў Ю. Я., могуць быць вырашаны Міністэрствам абароны і Львоўскім абкамам партыі. Т. Якаўлеву Ю. Я. растлумачана падчас гутаркі па тэлефоне 15 лістапада 1973 г., з чым ён згодзен...»* З ЦК не паспрачаешся.

На шчасце, Клаўдзіі Іванаўне Шалікавай, якая вярнулася з вайны сямнаццацігадовай, з двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «За адвагу» і «За баявыя заслугі», дапамаглі... Найперш — камандуючы Прыкарпацкай ваеннай акругі Валянцін Іванавіч Варэннікаў, на той час генерал-палкоўнік. Жанчына пачала шмат ездзіць па краіне, выступаць перад моладдзю. Камсамольцы Беларусі (усё ж Беларусі!) дапамагалі з аперацыяй па вяртанні зроку... У 1990-я гады Клаўдзія Ільінічна жыла ў Курску. З удзячнасцю расказвала журналістам, якія завіталі да яе, пра пісьменніка Юрыя Якаўлева, з якім сустракалася ў Маскве ў рэдакцыі газеты «Известия»...

А што да мастацкага фільма пра подзвігі юнай франтавой радысткі, пра яе жыццё — «Калыханка для мужчын» (зняты ў 1976-м на кінастудыі імя М. Горкага), то ролю Клаўдзіі выканала Люсьена Аўчыннікава, заслужаная артыстка РСФСР. Ёй быў зразумелы вобраз сваёй гераіні. Люсьена нарадзіннем з 1931 года, з Алеўска, ва Украіне. Дачка афіцэра-пагранічніка. Калі дзяўчынцы было шэсць гадоў, памерла маці. Бацька ажаніўся іншы. Дзяўчынка пампатавалася з сям'ёю па розных рэспубліках Савецкага Саюза. А ў 17 гадоў уцякла з дому, каб паступіць вучыцца на артыстку кіно... Разуменне самастойнасці, веданне вайны па лёсах блізкіх людзей — усё гэта спрыяла стварэнню дакладнага вобраза амаль што яе равесніцы.

Клаўдзія Шалікава, дарэчы, — ганаровы грамадзянін украінскага Цярнопаля, горада, які і яна, радыстка батарэі 302-й стралковай дывізіі, вызваляла ад фашыстаў. У 2010 годзе пасмяротна званне ганаровага грамадзяніна Цярнопаля атрымаў і Сцяпан Бандэра. Як і сумна вядомы Раман Шухевіч... Час выбірае сваіх герояў? Ці гэта людзі слепа губляюцца ў часе?..

**Мікола БЕРЛЕЖ, Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ.**

# КАРШЭРЫНГ, ДТЗ, ПРАВАПАРУШЭННІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аказваецца паслуга юрыдычным і фізічным асобам пры нястрогай і строгай (з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП)) аўтэнтыфікацыі, расказаў **Андрэй БУСЬКО, вядучы спецыяліст аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

— *Звесткі пра ДТЗ даюцца з АІС Дзяржаўтаінспекцыі. У гэтую інфармацыю ўваходзіць дата здарэння, яго від, катэгорыя, жывёла, якая ўдзельнічала ў аварыі (калі яна была), выява ДТЗ і інфармацыя пра пашкоджанні.* ***Усе гэтыя звесткі можна атрымаць толькі па аўто, якія зарэгістраваныя ў ДАІ (не знаходзяцца на транзітных нумарах).*** *Важны нюанс: унясенне звестак пра ДТЗ у сістэму Дзяржаўтаінспекцыі да 1 студзеня 2022 года было неабавязковым, таму праверыць інфармацыю пра здарэнне, якое адбылося з машынай раней за гэты тэрмін, магчыма, не атрымаецца. Не ўносяцца ў базу і звесткі пра ДТЗ, калі яго ўдзельнікі не выклікалі ДАІ, а афармлялі еўрапратакол.*

Паслугу пра аўто, дарэчы, са жніўня заказалі ўжо тры тысячы разоў. Чакаецца, што ў будучыні можна будзе даведацца, ці не знаходзіцца аўтамабіль у залогу, але гэта будзе ўжо самастойнай электроннай паслугай.

## Праверка пасведчання кіроўцы на сапраўднасць...

Апошнім часам вырасла колькасць правапарушэнняў і ДТЗ з удзелам перавозчыкаў і аўтамабіляў каршэрынгавай службы, таму былі распрацаваны дзве новыя паслугі. Паслуга **3.06.08 «Пацвярджэнне факта выдачы пасведчання кіроўцы на права кіравання мапедам, матацыклам, аўтамабілем, саставам транспартных сродкаў, трамваем, тралейбусам»** дазваляе ў рэжыме рэальнага часу праверыць факт выдачы пасведчання кіроўцы. Яна можа стаць цікавай кампаніям, якія аказваюць паслугі па арэндзе і пракаце ТС, заўважыў спецыяліст:

— *Вельмі папулярны кірунак — каршэрынг. Калі чалавек рэгіструецца ў праграме каршэрынгавай кампаніі, ён мусіць прымацаваць пералік дакументаў, сярод якіх — пасведчанне кіроўцы. Праз нейкі час менеджар кампаніі, які праверыў дакументы, вырашае, ці актываваць акаўнт заяўніка. Рызыка ў тым, што з дапамогай графічных рэдактараў можна накласці сваю выяву на фота пасведчання кіроўцы, а сапраўднага дакумента не мець. Наша паслуга дазваляе спыніць факт стварэння акаўнта ў каршэрынгавай праграме чалавекам, які не мае пасведчання кіроўцы. Кампанія, якая замаўляе ў нас паслугу пацвярджэння факта выдачы пасведчання кіроўцы чалавеку, які да іх звярнуўся па арэнду, атрымае пацвярджэнне гэтаму або звесткі, што такога дакумента не існуе.*

## ... і абмежаванні

Можа здарыцца, што пасведчанне кіроўцы ў чалавека ёсць, але права доступу на кіраванне аўто ў яго абмежавана. Высветліць гэта дапаможа паслуга **3.06.09 «Праверка наяўнасці звестак аб абмежаванні ў праве кіравання механічнымі транспартнымі сродкамі па ідэнтыфікацыйным нумары, выдадзеным пасведчанні кіроўцы».**

Абмежаванне (на год ці два) можа накладацца, напрыклад, з-за медыцынскай даведкі, атрымаць якую чалавеку, у якога маюцца пэўныя парушэнні (сардэчныя, псіхалагічныя), будзе праблематычна, пакуль стан здароўя не стабілізуецца.

— *Напрыклад, калі ў сістэме ёсць запіс, што чалавек звяртаўся па меддапамогу з прычыны павышанай трывожнасці ці стрэсу і атрымліваў лячэнне, гэта стане прычынай для абмежавання кіравання аўто, напрыклад, на год, і садзіцца за руль гэты тэрмін яму нельга. Калі злоўжываць гэтым абмежаваннем, можна і пасведчання кіроўцы пазбавіцца,* — прывёў прыклад Андрэй Бусько.

Бывае, што чалавек ужо мае акаўнт у каршэрынгавай кампаніі, а абмежаванні на права кіравання ці канфіскацыю пасведчання кіроўцы атрымаў пазней, але ж працягвае карыстацца сэрвісам. Кампаніі варта заказваць паслугу праверкі абмежавання на кіраванне, таму што калі такая асоба арандуе аўто і яе спыняць, то каршэрынгавы ТС могуць канфіскаваць на карысць дзяржавы (калі пасведчанне было адабрана за язду ў нецвярозым стане), і такія выпадкі не рэдкасць.

Абедзве паслугі (кожная каштуе 0,84 рубля) дапамогуць прыняць правільнае рашэнне і адказным асобам у арганізацыях, якія ажыццяўляюць пасажырскія і грузавыя перавозкі (напрыклад, аўтобуснаму парку), бо зразумела, што кіроўцу можна дапускаць на маршрут, калі ў яго ёсць пасведчанне і няма абмежаванняў на кіраванне. Ініцыятарамі стварэння гэтых паслуг, якія запрацавалі з сакавіка, фактычна і сталі каршэрынгавыя кампаніі, якія да гэтага не маглі аператиўна праверыць наяўнасць у грамадзяніна пасведчання кіроўцы (гэтыя звесткі маглі атрымліваць толькі ўпаўнаважаныя органы).

## Сям'я, рэгістрацыя, легітымнасць

Блок паслуг МУС, распрацаваных згодна з Указам № 107 «Аб біяметрычных дакументах», датычыцца атрымання інфармацыі, якой няма на ID-картцы. Гэта паслуга **3.50.01/1 «Атрыманне звестак аб месцы жыхарства і месцы знаходжання грамадзяніна (з атрыманнем згоды фізічнай асобы)».** Згода атрымліваецца ў электронным выглядзе праз падпісанне ЭЛП асобы. Паслуга **3.50.01/2 «Атрыманне звестак аб месцы жыхарства і месцы знаходжання грамадзяніна (без атрымання згоды фізічнай асобы)»** аказваецца, калі орган, які запытвае звесткі, мае на гэта законныя падставы, расказала **Алена ЗАНЬКО, вядучы спецыяліст аддзела электроннай камерцыі НЦЭП:**

— *Гэтыя звесткі даюцца з сістэмы Уліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства па месцы пражывання і месцы знаходжання. Запыт ідзе па ідэнтыфікацыйным нумары дакумента, які сведчыць асобу, і даце нараджэння чалавека.*

Паслуга **3.40.01/1 «Атрыманне персанальных даных (ПД) з ДзІС «Рэгістр насельніцтва» пры ўмове згоды фізічнай асобы»** і паслуга **3.40.01/2 «Атрыманне персанальных даных з ДзІС «Рэгістр насельніцтва» без згоды фізічнай асобы»** датычацца звестак аб складзе сям'і і дзецях.

— *Прынцып іх атрымання аналагічны паслугам, пералічаным вышэй. Прычым запыт у ДзІС «Рэгістр насельніцтва» робіцца толькі па ідэнтыфікацыйным нумары. Калі ж па паслугу звяртаецца юрыдычная асоба, яна падпісвае зварот сваім ЭЛП,* — падкрэсліла спецыяліст. — *У адказе прыходзіць некалькі блокаў інфармацыі: ПД сужэнца і ПД аб дзецях (іх пол, імя, дата нараджэння, рэквізіты дакумента, які сведчыць асобу, калі малыя яго атрымлівалі, і нават дата пазбаўлення бацькоўскіх правоў, калі такое было).*

Паслугі **3.40.01/2 ф і 3.50.01/2 ф** любая асоба можа атрымаць і адносна самога сябе. Яны могуць спатрэбіцца, калі чалавек не давярае праверку гэтых звестак арганізацыі, — тады ён праз адзіны партал атрымлівае інфармацыю аб сабе і паказвае арганізацыі. Усе гэтыя паслугі бясплатныя, удакладніла Алена Занько.

У Рэгістры насельніцтва няма звестак пра сапраўднасць дакументаў, але можна даведацца пра іх легітымнасць з дапамогай паслугі **3.40.08 «Праверка легітымнасці дакументаў, якія сведчаць асобу».** Запытваецца яна па ідэнтыфікацыйным нумары ID-карткі, а ў адказе прыходзіць прыкмета легітымнасці дакумента на дату запыту. Гэтая паслуга платная (0,84 рубля), за выключэннем выпадкаў, калі арганізацыя мае заканадаўчую падставу на бязвыплатнае атрыманне інфармацыі. Паслуга можа спатрэбіцца, напрыклад, работадаўцы або банкам для заключэння дагавораў.

## Заява — аплата — працяг заказу паслугі

Менавіта такі алгарытм неабходна выканаць, каб атрымаць паслугу **3.19.02 «Прадастаўленне фізічным асобам звестак пра правапарушэнні, што захоўваюцца ў адзіным дзяржаўным банку аб правапарушэннях»,** якую асоба можа запытаць у дачыненні да самой сябе ці свайго падапечнага, апекуном якога яна з'яўляецца, патлумачыла прадстаўніца НЦЭП:

— *У сваім асабістым кабінеце чалавек запаўняе заяву на атрыманне паслугі па атрыманні звестак аб правапарушэннях ці судзімасцях. Пасля ён падае заяву і аплачвае яе: адна базавая велічыня (на сёння — гэта 37 рублёў) плюс 0,84 рубля за саму паслугу, калі адказ патрэбны ў паскораным рэжыме цягам трох рабочых дзён (дзень адпраўкі заявы пры гэтым не лічыцца рабочым днём), і палова базавай плюс 0,84 рубля — калі адказ звычайны (цягам 15 дзён).* ***Пасля аплаты неабходна вярнуцца да паслугі і націснуць кнопку «Працягнуць»!*** *Калі гэтага не зрабіць, то заява не сфарміруецца канчаткова: не прыйдуць звесткі, што яна аплачана, і запыт не адправіцца ў асабісты кабінет супрацоўніка МУС, дзе чалавек хоча атрымаць даведку.*

З-за такога ланцужка дзеянняў узнікае шмат непаразуменняў. Людзі пасля аплаты заявы часта не завяршаюць заказ паслугі (не цiснуць кнопку «Працягнуць»), а потым скардзяцца, што аплата ёсць, а паслугі няма.

— *Людзі заказваюць такую інфармацыю, як правіла, да нейкіх падзей, напрыклад, калі некуды ад'язджаюць і ім патрэбна віза. Яны плацяць за паскораны адказ, а яго няма. Пры гэтым яны мусяць фізічна прыходзіць у вызначаны орган па дакумент. Каб атрымаць адказ у электронным выглядзе, асоба мусіць прайсці строгую аўтарызацыю і падпісаць заяву ЭЛП фізічнай асобы, таму большасць абірае варыянт забраць адказ самастойна,* — удакладніла Алена Занько. — *Тэрмін гатоўнасці даведкі, дарэчы, такі не імгненны, бо працэс адказу на яе не аўтаматызаваны. Супрацоўнік МУС, атрымліваючы заяву на паслугу, уручную правярае ў некалькіх крыніцах, ці прыцягвалася асоба да адказнасці, а потым, ізноў жа ўручную, уносіць гэтыя звесткі ў даведку.*

Калі здарылася сітуацыя з незавершаным заказам паслугі і чалавек зразумеў сваю памылку, можна вярнуцца ў асабісты кабінет і завяршыць свой запыт — тэрміну, які б абмяжоўваў час заказу паслугі, не існуе. Але найперш, раяць у цэнтры, трэба быць уважлівым і прытрымлівацца інструкцыі пры заказе паслугі.

**Ірына СІДАРОК.**


НЦЭУ **ДАВЯРАЙ, АЛЕ ПРАВЯРАЙ!**

**Электронная паслуга 3.06.08**
**«Пацвярджэнне факта выдачы вадзіцельскага пасведчання на права кіравання мапедам, матацыклам, аўтамабілем, саставам транспартных сродкаў, трамваем, тралейбусам».**

**Для каго?**

✓ кампаніі, якія аказваюць паслугі па пракаце і арэндзе транспартных сродкаў;
✓ арганізацыі, якія выконваюць пасажырскія і грузавыя перавозкі.



**Калі прымяніць?**

✓ пераканацца ў надзейнасці абранага кандыдата пры працаўладкаванні ў якасці кіроўцы;
✓ спыніць факт стварэння акаўнта ў дадатку каршэрынгавай кампаніі карыстальніку, які не мае пасведчання кіроўцы.

Нацыянальны цэнтр электронных паслуг. УНП 191700161

Падрабязней – на адзіным партале электронных паслуг: https://platform.gov.by


## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Банку Англіі заклікалі жыхароў краіны змірыцца з тым, што яны сталі бяднейшымі

Брытанцам неабходна змірыцца з тым, што іх фінансавае становішча стала горшым. Пра гэта заявіў вядучы эканаміст Банка Англіі Х'ю Піл, паведаміла РІА «Навіны». Паводле яго слоў, жыхары Злучанага Каралеўства сталі жыць горш з-за таго, што краіне даводзіцца закупляць вялікія аб'ёмы газу па высокіх цэнах. Такім чынам, выдаткі на імпарт блакітнага паліва ўзраслі. У той жа час кошт паслуг, якія Вялікабрытанія прадае за мяжой, застаўся на тым жа ўзроўні. Эканаміст заявіў, што пакупніцкую здольнасць брытанцаў нельга падтрымаць толькі за кошт павышэння заробкаў. Піл таксама выступіў супраць таго, каб перакладаць на канчатковых спажыўцоў цяжар росту цэн на электрычнасць. Паводле даных брытанскай статыстыкі, рэальныя прыбыткі жыхароў Злучанага Каралеўства падаюць самымі хуткімі тэмпамі за апошнія дзесяць гадоў. З-за павышэння цэн у Вялікабрытаніі пашыраецца хваля забастовак. На пратэсты выходзяць работнікі чыгуначнага транспарту, аэрапортаў, а таксама паштальёны, адвакаты.

### У Грэцыі 50 партый і кааліцый падалі заяўкі на ўдзел у парламенцкіх выбарах

Паўсотні палітычных партый, кааліцый і асобных кандыдатаў падалі заяўкі ў Вярхоўны суд Грэцыі па грамадзянскіх і крымінальных справах (Арэапаг) на ўдзел у парламенцкіх выбарах 21 мая. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на грэчаскі тэлеканал Skai. Паводле яго звестак, заяўкі на ўдзел у выбарах падалі 38 партый, 10 партыйных кааліцый і 2 самастойныя кандыдаты. Заяўкі накіравалі ўсе шэсць партый папярэдняга складу парламента, які быў распушчаны 22 красавіка ў сувязі з выбарамі. Колькасць пададзеных заявак удвая перавышае тую колькасць, якая была накіравана ў Арэапаг перад папярэднімі выбарамі чатыры гады таму. Тады аб сваім жаданні прыняць удзел у іх заявілі 24 партыі і кааліцыі.

### Рост эканомікі еўразоны адчувальна запаволіўся



Рост ВУП 20 краін еўразоны ў першым квартале запаволіўся да 1,3 працэнта ў гадавым выражэнні. Пра гэта паведаміла статыстычнае агенцтва Еўрастат. Паказчык росту эканомікі за чацвёрты квартал мінулага года склаў 1,8 працэнта. Паводле звестак Еўрастата, за 2021 год сукупная эканоміка краін еўразоны і ЕС узрасла на 5,3 працэнта. ТАСС са спасылкай на даныя даклада аналітыкаў Міжнароднага валютнага фонду паведаміла, што інфляцыя ў еўрапейскіх краінах можа заставацца на высокім узроўні даўжэй, чым чакалася. Гэта адбудзецца ў тым выпадку, калі біржавыя цэны на газ і іншыя энерганосьбіты будуць дэманстраваць значны рост.

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в дер. Прилепы, ул. Рябиновая (объект 56/2021), аг. Слобода, ул. Красногвардейская (объект 116/2021), дер. Прилепская Усяжка, ул. Подлесная (объект 118/2021) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области**

***Организатор аукциона: Озерицко-Слободской сельский исполнительный комитет, 222215, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, д. 27, Смолевичский район, Минская область***

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | дер. Прилепы, ул. Рябиновая | 624883004801000132 | 0,1065 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 30 000 |
| 2 | аг. Слобода, ул. Красногвардейская | 624883009601001051 | 0,0874 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 35 000 |
| 3 | дер. Прилепская Усяжка, ул. Подлесная | 624883008201000131 | 0,15 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10902 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | 20 000 |

Аукцион состоится **31 мая 2023 г. в 15.00** в Озерицко-Слободском сельском исполнительном комитете по адресу: аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Смолевичский район, Минская область, зал заседаний (тел.: 801776, 50066).

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственный комитет по имуществу: **https://au.nca.by**, Минский областной исполнительный комитет: **https://info@minsk-region.gov.by,** Смолевичского райисполкома: **isp@smolevichi.gov.by.**

УНП 600046563

## Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3»

проводит **18 мая 2023 года в 11.00**

повторный открытый аукцион по продаже имущества

1. Наименование продавца – организатора аукциона, его место нахождения и контактные телефоны: ОАО «ДСТ № 3», г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, тел. 8 0222 712424.

2. Наименование имущества и его местонахождение, начальная цена.

К отчуждению предлагаются:

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-72602, площадью 108,00 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – Бытовое помещение, составные части и принадлежности – отапливаемая пристройка, благоустройство территории, асфальтобетонное покрытие, ограждение железобетонное, ворота центральные, калитка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4239, площадью 644,0 кв. м, назначение – Здание нежилое, наименование – Гараж с котельной, составные части и принадлежности – Две пристройки, холодная пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/2;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4244, площадью – 497,0 кв. м, назначение – Здание нежилое, наименование – Гаражи № 2, составные части и принадлежности – Пристройка, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/3;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4271, площадью – 19,0 кв. м, назначение – Здание нежилое, наименование – Автозаправочная станция, составные части и принадлежности – Насыпь для емкостей, мощение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/4;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4238, площадью 60,0 кв. м, назначение – Здание нежилое, наименование – Здание стоянки дорожной техники, составные части и принадлежности – Навес, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000161 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 278Б/1;

• капитальное строение с инвентарным номером 710/С-4269, площадью 11,0 кв. м, назначение – Здание нежилое, наименование – Здание КНС, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002891 по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Бахарова, 274А.

Имущество по частям не продается.

**Суммарная начальная стоимость имущества – 253120,00 белорусских рублей без учета НДС.**

3. Информация о земельном участке. Имущество, предлагаемое к отчуждению, расположено на земельных участках с кадастровыми номерами:

- 741000000007000161, площадью 1,1195 га, находящемся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3»;
- 741000000007002891, площадью 0,004 га, находящемся в постоянном пользовании ОАО «ДСТ № 3».

4. Дата, время и место проведения аукциона: **18.05.2023 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, конференц-зал.

5. Место, дата и время окончания приема заявлений на участие в аукционе с прилагаемыми к ним документами: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33; дата: **12.05.2023; время: 17.00**.

При подаче заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, подписывает с ОАО «ДСТ № 3» соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

На участие в аукционе к заявлению прилагаются:

- документ, подтверждающий внесение задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка;
- копия (без нотариального засвидетельствования) устава (учредительного договора – для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), имеющего штамп, свидетельствующий о проведении государственной регистрации, – для юридических лиц Республики Беларусь;
- копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации – для индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь;
- доверенность (в случае необходимости).

6. Срок возможного снятия имущества с аукциона: за 3 дня до даты проведения аукциона.

7. Участник аукциона за 3 дня до проведения аукциона должен перечислить организатору аукциона задаток в размере 10 % от первоначальной стоимости без НДС. Реквизиты текущего (расчетного) счета, на который должна быть перечислена сумма задатка: р/с BY54BPSB30121192410119330000 код BPSBBY2X в ОАО «Сбер Банк», УНП 700049607.

8. Информация о порядке и сроках возмещения затрат на организацию и проведение аукциона: в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона.

